

КАЦЯРЫНА СНЫЦІНА: ПРА БАСКЕТБОЛ, ТАТУІРОЎКІ І САБАК **11**

НА РОВАРЫ ПА ВАЛОЖЫНШЧЫНЕ: ШТО РАСКАЖА РЭГІЁН? **12**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 ВЕРАСНЯ 2018 г. АЎТОРАК № 169 (28785)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар КАРАНКЕВІЧ, міністр энергетыкі:**

*«Думаю, мы будзем разглядаць пытанні ўдасканалення арганізацыйнай структуры Міністэрства энергетыкі, у тым ліку накіраванага на аптымізацыю колькасці персаналу з улікам укаранення высокаэфектыўных тэхналогій і абсталявання. Самае галоўнае, каб пры гэтым захавалася функцыянальнасць беларускай энергасістэмы, яе надзейнасць. Сярод асноўных задач — увод у эксплуатацыю Беларускай атамнай электрастанцыі ва ўстаноўленыя тэрміны, яе паспяховая інтэграцыя ў энергасістэму і эканоміку краіны, павышэнне эфектыўнасці работы энерга- і газазабяспечвальных арганізацый. Таксама ў цэнтры ўвагі будзе павышэнне якасці аказання паслуг па электра- і газазабяспячэнні».*

# ДЗЕНЬ ВЕДАЎ НА МАЛОЙ РАДЗІМЕ

### «Толькі ведаючы шлях дадому, можна ўпэўнена рухацца наперад», — сказаў Прэзідэнт, які 1 верасня наведаў родную школу

**Першакласнікі хвалююцца і чакаюць свайго першага званка. Вучні старшых класаў ужо ведаюць, што з панядзелка трэба брацца за вучобу. Першы дзень восені — не толькі Дзень ведаў, але і дзень сустрэч. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў мінулую суботу наведаў сярэднюю школу ў аграгарадку Александрыя Шклоўскага раёна. Для Прэзідэнта гэта родная ўстанова, дзе яго і зараз сустракаюць настаўнікі. «Вы ведаеце, што гэта школа займае асаблівае месца ў маім жыцці, — падзяліўся кіраўнік дзяржавы. — Так будзе і ў вас. Калісьці і я, будучы вучнем, стаяў на лінейцы, чакаючы чарговага навучальнага года. З тымі падзеямі звязана вялікая колькасць уражанняў, асабістых перажыванняў, самых розных. Але з часам усе яны сталі дарагімі сэрцу ўспамінамі».**



Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што дзеці павінны асэнсоўваць, што ўсе школьныя ўрокі і кантрольныя — свайго роду рэпетыцыя дарослага жыцця. Каб прайсці гэты шлях годна, трэба браць усё, што дае школа. Трэба станоўча ставіцца і да цяжкасцяў. «Таму што менавіта яны вучаць пераадольваць сумненні і няўпэўненасць, выбудоўваць адносіны з аднакласнікамі і педагогамі. Гэта і ёсць каштоўны вопыт, які стане для вас сур'ёзнай апорай у будучыні», — звярнуўся да дзяцей кіраўнік дзяржавы.

Настаўнікі заўсёды падкажуць выйсце з цяжкага становішча і, як звярнуў увагу Прэзідэнт, менавіта самыя патрабавальныя, уважлівыя і мудрыя застануцца ў памяці. Яны вучаць прымаць рашэнні і дзейнічаць у няпростых сітуацыях, якія таксама трапляюцца ў нашым імклівым жыцці.

СТАР. 2

## КОРАТКА

- Прадстаўнікі 13 дзяржаў праводзяць інспекцыю дзвюх воінскіх часцей Узброеных Сіл Беларусі ў рамках курсу па выкананні міжнародных дагавораў у галіне кантролю над узбраеннямі.
- **Найбольш чыстымі ў Беларусі па гідрабіялагічным і гідрахімічным паказчыках прызнаныя рэкі Вілія, Бесядзь, Іпуць і Цна.**
- Беларускі тэнар Павел Пятроў стаў пераможцам прэстыжнага міжнароднага конкурсу маладых вакалістаў Operalia-2018.



- **Беларуская чыгунка 8 верасня прызначыла дадатковы цягнік міжрэгіянальных ліній эканом-класа па маршруце Мінск — Ліда ў сувязі з правядзеннем у горадзе фестывалю LIDBEER 2018.**

■ Крыніца духоўнасці

# СВЯТА ВЫСОКАЙ ПАВАГІ ДА СЛОВА

### У ІВАНАВЕ ПРАЙШОЎ ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМЕНСТВА

**Старажытнае Іванава не проста папрыгажэла, прыбралася да святкаванняў, — яно памаладзела. Як сказала маладая гараджанка Аксана Клімовіч: «Аднойчы я нібы прачнулася ў іншым горадзе». Цэнтральная частка былога Янова, яго парк, вуліцы набылі сучасную стылёвасць, нейкі асаблівы глянец, які яднае палескі гарадок з невялікімі ўтульнымі еўрапейскімі гарадамі.**



Фота БелТА.

Усё, што зроблена апошнім часам, застанецца іванаўцам, будзе іх радаваць і надалей. А ўсім, хто прыехаў сюды першага і другога верасня, было прыемна адзначаць XXV Дзень пісьменства. І відаць, самай знакавай падзеяй стала адкрыццё кніжнай крамы пад назвай «Верасень» у будынку ўнівермага. Раней у райцэнтры зусім не было кнігарні, а «Верасень» цяпер будзе нагадваць гараджанам пра святкаванне. Шмат кніг прысвечаны гісторыі і сучаснасці роднага краю. А **генеральны дырэктар ААТ «Белкніга» Аляксандр ВАШКЕВІЧ** падкрэсліў на цырымоніі адкрыцця, што ў новай краме ўсю неабходную літаратуру і канцылярскія тавары могуць набываць і школьнікі.

Дзецям наогул было прысвечана шмат самых розных мерапрыемстваў на святкаванні. Яно і зразумела: звышзадача грамадства сёння — прыцягнуць маладое пакаленне да кнігі, абудзіць яго інтарэс да літаратурных герояў. На гэта быў накіраваны і конкурс юных чытальнікаў, і шматлікія акцыі Фестывалю кнігі і прэсы. Сімвалічна, што праграма мерапрыемстваў пачалася з урачыстай лінейкі ў беларускамоўнай сярэдняй школе № 4 «Пісьменства Беларусі — крыніца культуры і духоўнасці народа».

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

# ДЗЕНЬ ВЕДАЎ НА МАЛОЙ РАДЗІМЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У александрыйскай школе ёсць свае педагагічныя дынастыі. Аляксандр Лукашэнка ў свой час сам вяртаўся сюды настаўнікам і ніколі не губляў сувязь з роднай зямлёй. «Я магу сказаць дакладна, што толькі ведаючы шлях дадому, можна ўпэўнена рухацца наперад», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Веды не дзеля адзнакі, а дзеля высокіх мэт — гэта ключ да будучыні. Жадаючы землякам поспехаў у гэтым навучальным годзе, кіраўнік дзяржавы сказаў, што ён будзе паспяховым, калі адразу настроіцца на сур'ёзную працу. Але не трэба забываць і пра адпачынак. Найлепшы, на думку Прэзідэнта, — гэта фізічная актыўнасць. Дарэчы, навучэнцы школы ў падарунак ад кіраўніка дзяржавы атрымалі новае абсталяванне для спартыўнай пляцоўкі. І адразу ж першага верасня яго апрабавалі. Прэзідэнту яны падарылі фотаальбом «Сцяжынкамі малой радзімы».

Павіншавала ў гэты святочны дзень александрыйскіх школьнікаў і спявачка Алёна Ланская, якая ўсіх натхніла сваімі песнямі. Юлія Быкава таксама спела некалькі кампазіцый для вучняў і іх бацькоў.

Пасля такога незвычайнага адкрыцця лінейкі празвінеў першы званок, а Прэзідэнт пайшоў у клас старога будынка сваёй



Фота БелТА.

школы, дзе яго чакалі 18 першакласнікаў. На сваім першым уроку яны пачулі наказы і віншаванні ад кіраўніка дзяржавы, а таксама расказ пра тое, як ён сам праводзіў свае школьныя гады. Як сядзеў за трэцяй партай, а потым вярнуўся ў навучальную ўстанову ў якасці педагога.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка сустрэўся са сваімі настаўнікамі. Разам з імі ён успомніў былыя часы. Таццяна Карпечанка *(на фота)* была яго класным кіраўніком. Налета ёй споўніцца 95 гадоў. Яна запрасіла Прэзідэнта на свой юбілей. Разам з настаўнікамі яны зрабілі сумеснае фота на памяць.

Не менш за першакласнікаў хвалюецца і новы дырэктар Александрыйскай сярэдняй школы Аляксандр Бобрыкаў. Ён прыступіў да абавязкаў у сярэдзіне жніўня, ужо асвоіўся і гатовы сустракаць сваіх вучняў. Дарэчы, усяго ў школе ў гэтым годзе будуць навучацца 206 юнакоў і дзяўчат.

«Сучасная база школы вельмі моцная, новае абсталяванне ўсё ўстаноўлена, у нас новы вучэбны клас хіміі, сучасны клас фізікі, кабінет інфарматыкі, — расказвае дырэктар. — Таксама для пачатковых класаў падарылі мультыборды. Гэта значыць на сёння гэта не школа, а казка ў маім уяўленні. Дагэтуль я працаваў у іншай школе, камплектацыя там таксама на высокім узроўні, але тут няма параўнання».

Сваё першага верасня Аляксандр Бобрыкаў таксама вельмі добра памятае. Як ён хваляваўся, стоячы з букетам астраў у першым радзе. Але адзначае, што сёлета для яго, як для новага дырэктара, дзень не менш хвалюючы. Як кіраўнік сельскай школы, ён звяртае ўвагу, што тут галоўнае — клопат настаўнікаў і бацькоў. «Сельская школа сёння практычна нічым не адрозніваецца ад гарадской. Аснашчэнне ў нас нават лепшае. Да таго ж у нас класы меншыя, гэта значыць увагу навучэнцам мы можам даваць нашмат больш, чым у гарадскіх школах. Гэта характарызуе нашу паспяховасць. Каля 50 % нашых выпускнікоў ідзе ў вышэйшыя навучальныя ўстановы».

У александрыйскую школу прыходзяць і маладыя настаўнікі, такія як Уладзіслаў Захарэнь. Сам ён з Мёршчыны, у Александрыю трапіў па размеркаванні. У хлопцаў 5—9 класаў Уладзіслаў будзе выкладаць працоўнае навучанне. Разлічвае заахвоціць вучняў нацыянальнымі рамёствамі.

Дарэчы, да гэтага вучэбнага года ў краіне пабудаваны тры новыя школы: у Мінску, Бабруйску і Ляскаўцы (Мінскі раён). Сёння каля 110 тысяч першакласнікаў пайшлі ў навучальныя ўстановы краіны. Першы ўрок прайшоў пад назвай «Мне выпала шчасце тут нарадзіцца...» і быў прысвечаны Году малой радзімы.

**Надзея АНІСОВІЧ,**

*аг. Александрыя.*

# ПЕРШАЯ ПРЫСТУПКА САМАЯ ВАЖНАЯ

## Найвышэйшыя дзяржаўныя асобы краіны наведалі родныя школы і гімназіі



**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА** паехала ў гімназію № 1 імя Францыска Скарыны ў Полацку. Паводле яе слоў, прысутнасць 1 верасня ў роднай установе адукацыі дадае хвалявання, бо тут вучыліся браты і дзеці Наталлі Качанавай. Яна адзначыла, што кожны год сустракаецца з аднакласнікамі і настаўнікамі. «З гадамі ўспаміны пра школу ўсё ярчэйшыя і вастрэйшыя. Бо школа — гэта наша жыццё», — дадала кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

У падарунак ад яе гімназія атрымала інтэрактыўную панэль, а ад Прэзідэнта Наталля Качанава перадала першакласнікам кнігі «Беларусь — наша Радзіма». Старшыня Полацкага райвыканкама Мікалай Шаўчук падарыў сертыфікат на набыццё камп'ютарнага класа.

Наталля Качанава вучылася тут, калі гэта ўстанова адукацыі яшчэ была сярэдняй школай № 7. Яна прайшлася па родных калідорах, наведала свой клас, а таксама сустрэлася са сваімі настаўнікамі, якім падзякавала за тое, што выхавалі уменне вучыцца, любоў да Беларусі.

**Прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС** 1 верасня наведаў



святочную лінейку ў сярэдняй школе № 2 Турава, у якую сам калісьці пайшоў у першы клас. У сваім віншаванні навучэнцам, іх бацькам і настаўнікам кіраўнік Савета Міністраў адзначыў, што найважнейшы абавязак дзяржавы — стварыць роўныя ўмовы для атрымання якаснай адукацыі, аднак шмат што залежыць і ад канкрэтнага вучня. У гэтым годзе ў тураўскай школе № 2 — 15 першакласнікаў, але ў наступныя гады дынаміка будзе паляпшацца — такая сітуацыя кажа аб правільнай палітыцы ўлад па адраджэнні такіх населеных пунктаў, пра тое, што сюды вяртаецца моладзь, дадаў ён.

Сяргей Румас прыехаў не з пустымі рукамі: у падарунак школа атрымала мультымедыйную інтэрактыўную дошку і спартыўны інвентар. Гомельскі аблвыканкам перадаў вучням і настаўнікам камп'ютарны клас. Дарэчы, дзеці падарылі прэм'ер-міністру сувенір, які яны зрабілі сваімі рукамі.

Падчас наведвання школы Сяргей Румас расказаў некаторыя ўспаміны з дзяцінства. Цікава, што ў гэтую школу ён трапіў таму, што бацьку па працы перавялі з Гомеля ў Мінск і было прынята рашэнне адправіць дзіця на малую радзіму бацькоў. Кіраўнік урада дадаў, што быў добрым вучнем, а яго самыя яркія школьныя ўспаміны — пра буфет, дзе была самая смачная выпечка, і пра школьны стадыён, які ўвесь час займалі старшакласнікі.

1 верасня іншыя члены ўрада таксама правялі ў навучальных установах на сваёй малой радзіме.

**Паводле БелТА.**

# ДОБРЫ ПАЧАТАК

## Віншаванні і падарункі вучням ад кіраўнікоў парламента

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ** пабываў на ўрачыстай лінейцы ў магілёўскай гімназіі № 3. Гэта адна з найстарэйшых устаноў адукацыі горада з вялікімі і даўнімі традыцыямі. З яе сцен выйшлі сусветна вядомыя людзі — мастак Павел Масленікаў, акадэмік і даследчык Арктыкі Ота Шміт, прафесар медыцыны Ерафей Касценіч. Гімназія і зараз трымае высокія пазіцыі, тут вучыцца шмат пераможцаў рознага





ўзроўню алімпіяд, спартыўных спаборніцтваў.

— У краіне робіцца ўсё для таго, каб стварыць камфортныя ўмовы для рэалізацыі магчымасцяў падрастаючага пакалення, — адзначыў у сваёй віншавальнай прамове Міхаіл Мясніковіч. — Толькі разам мясцовая ўлада, школа, сям'я здольныя вырашыць пытанні выхавання годных грамадзян сваёй краіны.

Ад Савета Рэспублікі Міхаіл Мясніковіч перадаў дырэктару гімназіі сертыфікат на інтэрактыўную дошку.

— Той прыўзняты і ўзнёслы настрой, які пануе на такога роду мерапрыемствах, заўсёды кранае, — падзяліўся эмоцыямі Міхаіл Мясніковіч. — Прымяраеш гэта ўсё на сваё жыццё, на свой лёс. Гэта вельмі добрыя хвалявані. Я планаваў на Дзень ведаў быць у сваёй роднай школе на малой радзіме ў Снове. Але ў сувязі з тым, што ў Магілёве 10—12 кастрычніка запланавана правядзенне V Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі і трэба сачыць за падрыхтоўкай яго знакавых аб'ектаў, я прыехаў сюды. А ў сваю школу накіраваў тэлеграму з віншаваннямі з Днём ведаў.

**Спікер Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА** Дзень ведаў сустрэў у сваёй выбарчай акрузе — Докшыцкім раёне. Сярэдняя школа ў гарадскім пасёлку Бягомль 1 верасня адчыніла свае дзверы амаль для 400 вучняў, 39 з якіх — першакласнікі.

З пажаданнямі, каб школа для кожнага вучня стала другім домам, выступіў Уладзімір Андрэйчанка. Ён адзначыў, што ў Беларусі вельмі шмат робіцца для развіцця адукацыі, а сама адукацыя — гэта адзін з найгалоўнейшых прыярытэтаў у развіцці грамадства.

— У нашай краіне створаны ўсе належныя ўмовы для атрымання якаснай і даступнай адукацыі, — перадае словы Уладзіміра Андрэйчанкі карэспандэнт «Родных вытокаў». — Ваша школа — гэта ваша малая радзіма, дабрабыт якой залежыць толькі ад вас. Любіце школу, цаніце працу настаўнікаў, з радасцю спасцігайце новыя веды, якія ў будучыні дапамогуць знайсці кожнаму сваё месца.

Ад Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка прэзентаваў вучням інтэрактыўную панэль.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Марыя ДАДАЛКА.**

■ На слыху

# ЯКОЙ БУДЗЕ ПРЫБАЎКА?

## Заробкі бюджэтнікаў складуць 80 працэнтаў ад сярэдняга заробку па краіне

**Такі прагноз даюць у Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны на чацвёрты квартал гэтага года. Даходы насельніцтва вырастуць за кошт павелічэння з 1 верасня заробкаў асобным катэгорыям у сферы аховы здароўя і адукацыі, а таксама павелічэння з 1 кастрычніка тарыфнай стаўкі першага разраду.**

— Дадзеныя меры дазволяць забяспечыць узровень заработнай платы работнікаў бюджэтнай сферы ў 2018 годзе на ўзроўні 742 рублёў. У чацвёртым квартале яна складзе ў сярэднім 800 рублёў, гэта значыць суадносіны 80 працэнтаў да сярэдняга заробку па краіне будуць забяспечаны, — паведаміў БелТА **першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй ЛАБОВІЧ.**

На рэалізацыю гэтых мер будуць накіраваны дадатковыя сродкі кансалідаванага бюджэту — каля 500 мільёнаў рублёў за кошт сфарміраванага рэзервовага фонду.

У міністэрстве адзначаюць, што падлічыць, наколькі вырастуць сярэднія заробкі ў рублях, складана, паколькі многае залежыць ад стажу, кваліфікацыі канкрэтнага работніка і тых надбавак, якія ён мае. Па інфармацыі Белстата, у ліпені сярэдняя зарплата ў галіне аховы здароўя складала 766 рублёў, у адукацыі — 633 рублі. За год рэальныя даходы гэтых спецыялістаў выраслі на 12 працэнтаў.

Увогуле да 2025 года стаіць задача павялічыць заробкі медыкаў і педагогаў у два разы. Мяркуецца, што гэта дазволіць павысіць прэстыж прафесіі і спыніць адток кадраў. Так, на сёння ў краіне не хапае 2,4 тысячы ўрачоў: хірургаў, траўматолагаў, эндакрынолагаў, тэрапеўтаў, педыятраў. Адкрыта амаль 2,7 тысячы вакансій для медыцынскіх сясцёр. Ужо не першы год гэтыя прафесіі ўваходзяць у лік самых запатрабаваных. Напрыклад, у Мінску і Гомельскай вобласці медперсанал — самыя дэфіцытныя работнікі.

Калі казаць пра настаўнікаў, то ў базе для іх налічваецца больш за 300 прапаноў. Мяркуючы па заробках, якія пазначаны ў вакансіях, ад 600 рублёў гатовы плаціць пераважна сталічным педагогам. У рэгіёнах сумы больш сціплыя — часта ў аб'явах аб вакансіях пішацца мінімальны заробак.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# КАДРЫ І ЯКАСЦЬ АДУКАЦЫІ

**Рост заробкаў матывуе педработнікаў да павышэння якасці адукацыі. Такой думкі прытрымліваюцца ў галоўным адукацыйным ведамстве краіны.**

Нагадаем, што з 1 верасня тарыфныя стаўкі (аклады) педагагічных работнікаў і памочнікаў выхавальнікаў узрастаюць на 20 %. «Гэта дасць магчымасць павысіць узровень аплаты працы, забяспечыць матэрыяльную падтрымку работнікаў адукацыі, паменшыць адток кадраў і матываваць педагагічных работнікаў да павышэння якасці адукацыі», — падкрэсліваюць у міністэрстве.

Выступаючы ў нядзельным эфіры тэлеканала АНТ, **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА** праінфармаваў, што ўжо прапрацаваныя паэтапныя крокі павышэння заробкаў педагогаў на 2019—2020 гады. Гэта датычыцца і прафесарска-выкладчыцкага складу — адпаведнае даручэнне было дадзена кіраўніком дзяржавы на II З'ездзе вучоных.

У краіне створана рабочая група па распрацоўцы комплексных мерапрыемстваў па ўдасканаленні аплаты прафесарска-выкладчыцкага складу, павышэнні зацікаўленасці ў выніках педагагічнай і навуковай дзейнасці. У цэнтры ўвагі знаходзяцца таксама стыпендыі аспірантаў і дактарантаў, бо ні для кога не сакрэт, што калі выкладчык ВНУ ідзе вучыцца ў дактарантуру, то атрымлівае стыпендыю, нашмат меншую за яго заробак на выкладчыцкай пасадзе, таму жаданне займацца падрыхтоўкай доктарскай работы адразу знікае.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«Наша група на чале з прафесарам Уладзімірам Шымавым, рэктарам Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, адпрацавала падыходы па стымуляванні навуковых работнікаў, аспірантаў, дактарантаў», — удакладніў Ігар Карпенка.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

# Арыгінальнасць, прастата і якасць

## Як будзе мяняцца сталіца да лета наступнага года

**Учора ў мэрыі адбылася аператыўная нарада, на якой старшыня камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама Павел Лучыновіч паведаміў, што ў Мінску будуць падрыхтаваны прапановы па добраўпарадкаванні гарадскога асяроддзя да II Еўрапейскіх гульняў.**

Мяркуецца ўнесці змены ў сферу вонкавай рэкламы, сфарміраваць план мерапрыемстваў па канцэпцыях рэкламнага афармлення асноўных магістраляў сталіцы, а таксама зрабіць абавязковай для суб'ектаў гаспадарання распрацоўку схем азелянення і кветкавага афармлення прылеглых тэрыторый.

Павел Лучыновіч адзначыў, што галоўнае — гэта арыгінальнасць, прастата і якасць. Неабходна сканцэнтраваць усе рэсурсы на добраўпарадкаванні галоўных гарадскіх магістраляў, МКАД, спартыўных аб'ектаў, тэрыторый уздоўж веламаршрутаў, паблізу месцаў пражывання гасцей, станцый метрапалітэна, фан-зон, транспартнай інфраструктуры. Акрамя таго, у камітэце архітэктуры і горадабудаўніцтва лічаць важным звярнуць увагу на малыя архітэктурныя формы, напрыклад вулічныя лаўкі і іншае, каб яны адпавядалі сталічнаму статусу.

Эскізы планаваных пераўтварэнняў павінны ўзгадняцца з архітэктарамі і кіраваннем гарадской гаспадаркі. Адно з патрабаванняў — выключыць самавольную фрагментарную афарбоўку фасадаў будынкаў. Таксама камітэт вывучыць магчымасць устаноўкі ў месцах масавага адпачынку пітных фантанчыкаў.

Старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац прапанаваў правесці ў горадзе серыю семінараў па тэматыцы добраўпарадкавання, каб пазначыць асноўныя падыходы да ландшафтнага дызайну, горадабудаўнічага развіцця.

Адзначым таксама, што да 1 снежня 2018 года плануецца выпусціць карту госця II Еўрапейскіх гульняў. У карце будзе прадстаўлена больш за 60 атракцый, больш за 20 пунктаў грамадскага харчавання, каля 30 месцаў размяшчэння. Усяго ж будзе ўключана каля 200 аб'ектаў. Фактычна гэта будзе карта госця Мінска, якая ўжо існуе, але дапоўненая цікавымі гасцям і ўдзельнікам спаборніцтваў месцамі.

Працягваецца распрацоўка карты госця міжрэгіянальнага фармату. У яе ўключаць музеі, гасцініцы, буйныя гандлёвыя ўстановы, галерэі і іншыя аб'екты ў абласцях і ў Мінску. Чакаецца, што такая карта з'явіцца да канца 2018 года.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

■ Надвор'е

# ЦЁПЛА І СУХА

## У першыя дні верасня тэмпературны фон на 3—6 градусаў перавышае кліматычную норму і характэрны для сярэдзіны ліпеня

**Сёння ў другой палове дня, пераважна па паўночна-заходняй частцы краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах навальніцы. Тэмпература паветра павысіцца да плюс 22 — плюс 27 градусаў. Па паўднёвым усходзе паветра днём прагрэецца да 30 цяпла, перадаюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сераду ўмовы надвор'я ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску, сфарміраваная ў цёплым паветры, якое паступіла да нас з усходу Украіны. На заходняй частцы краіны адаб'ецца ўплыў маларухомага атмасфернага фронту, таму месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы туман. Вецер прагназуецца ўсходні, паўднёва-ўсходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 9 да плюс 16 градусаў, удзень будзе не менш за 21—28 цяпла.

Сухое і досыць цёплае надвор'е абяцаюць сіноптыкі і ў чацвер. Наша краіна ў асноўным апынецца пад уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску. Толькі ўначы і раніцай у крайніх заходніх раёнах Брэсцкай і Гродзенскай абласцей яшчэ будзе адбівацца ўплыў франтальнага падзелу, там месцамі пройдуць невялікія дажджы. Раніцай у асобных раёнах краіны магчымы туман. Вецер прагназуецца ўсходні, паўднёва-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе 9—16 цяпла, а днём будзе ад плюс 20 да плюс 27 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, не зменіцца характар надвор'я і ў канцы тыдня. Чакаецца павышаны тэмпературны рэжым, будзе мала дажджоў. Пры слабым ветры ў начныя і ранішнія гадзіны ў нізінах і паблізу вадаёмаў могуць узнікаць непрацяглыя туманы. Тэмпература паветра ўначы ў пятніцу складзе 10—16 цяпла, месцамі крыху яна будзе ніжэйшая — толькі плюс 7—9 градусаў. У другой палове дня будзе 21—28 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Эрдаган прапанаваў адмовіцца ў міжнародным гандлі ад долара ЗША

Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Таіп Эрдаган прапанаваў перайсці на разлікі ў нацыянальнай валюце ў гандлі. З такой заявай ён выступіў на VI Саміце Савета супрацоўніцтва цюркамоўных дзяржаў.

Па словах турэцкага прэзідэнта, залежнасць міжнароднага гандлю ад долара становіцца для яго перашкодай. «Мы прапануем весці гандаль у нацыянальных валютах, а не ў доларах ЗША», — заявіў Эрдаган.

VI Саміт Савета супрацоўніцтва цюркамоўных дзяржаў праходзіць у горадзе Чалпан-Ата ў Кыргызстане пад старшынствам прэзідэнта Кыргызстана Сааранбая Жээнбекава. У ім таксама бяруць удзел прэзідэнты Азербайджана, Казахстана, Турцыі, Узбекістана і прэм'ер-міністр Венгрыі.

## Макрон лічыць, што Пуцін хоча «дэмантаваць Еўрасаюз»



Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон у інтэрв'ю шведскаму тэлеканалу SVT выказаў меркаванне, згодна з якім марай прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна з'яўляецца «дэмантаж Еўрасаюза».

На пытанне вядучай пра тое, што Макрон думае аб адмове лідара папулісцкай партыі «Шведскія дэмакраты» Імі Окесана аддаць перавагу Эмануэлю Макрону або Уладзіміру Пуціну, кіраўнік Францыі адказаў, што «Расію нельга назваць прыкладам краіны, якая прытрымліваецца правоў чалавека». «Я ўвесь час кантактую з Пуціным, я паважаю яго, але марай Пуціна з'яўляецца дэмантаж Еўрасаюза», — сказаў у інтэрв'ю Макрон.

Ён таксама дадаў, што Францыя — «не з тых, хто ўрываецца на тэрыторыю суседняй краіны». «Калі ў вас калі-небудзь будуць праблемы, то дакладна не з Францыяй. Як і ў Швецыі, мы паважаем правы чалавека».

Раней на сумеснай прэс-канферэнцыі з кіраўніком Фінляндыі Саўлі Нііністё Макрон заявіў, што стабілізаваць адносіны паміж Расіяй і Еўрасаюзам дапаможа стратэгічнае партнёрства ў галіне абароны і бяспекі.

## Законапраект аб імкненні Украіны ў ЕС і НАТА зарэгістравалі ў Вярхоўнай радзе

Законапраект аб імкненні Украіны ў Еўрасаюз і НАТА, прапанаваны прэзідэнтам краіны Пятром Парашэнкам, зарэгістраваны ў Вярхоўнай радзе. Пра гэта паведаміла ў панядзелак прадстаўнік прэзідэнта Украіны ў парламенце Ірына Луцэнка.

«У Радзе сёння зарэгістраваны праект, прапанаваны прэзідэнтам, наконт змен у канстытуцыю аб замацаванні еўрапейскага, еўраатлантычнага напрамкаў развіцця», — сказала яна.

Па словах Луцэнкі, папраўкі, у прыватнасці, будуць датычыцца трох артыкулаў канстытуцыі. «Змены будуць унесены ў артыкулы 85, 102, 116, якімі прадугледжана адказнасць Вярхоўнай рады, прэзідэнта і кабінета міністраў па замацаванні еўрапейскага і еўраатлантычнага кірункаў», — удакладніла яна.

# ПАДАРОЖЖА Ў ГЛЫБІНІ БЕЛАРУСКАЙ ЗЯМЛІ

**можна ажыццявіць у Цэнтры апрацоўкі, даследавання і захоўвання керну вытворчага аб'яднання «Беларуснафта». А таксама пераканацца, што цёплыя хвалі марскія некалі плёскаліся ў тых мясцінах, якія сёння найбольш перспектыўныя для здабычы нафты**

**Самая глыбокая свідравіна, адкуль айчынныя геолагі дасталі ўзор для вывучэння — 7 кіламетраў. З зямных глыбінь цяпер выцягваюць да тысячы метраў пароды ў год. Такія каменныя слупкі дыяметрам 7-8 сантыметраў і даўжынёй да метра становяцца матэрыялам для навуковага вывучэння ў адзіным у нашай краіне Цэнтры апрацоўкі, даследавання і захоўвання керну. Знаходзіцца ён у Гомелі.**



Вядучы інжынер службы фізікі пласта Ірына БАБКОВА.

Керн — узор горнай пароды, які дасталі спецыяльным абсталяваннем са свідравіны. Знешне гэтыя камянюкі амаль не адрозніваюцца па колеры: той шэры, а побач — крыху цямнейшы і з дзірачкамі. Сапраўдны геолаг глядзіць не толькі на колер, але і на яго адценні, структуру каменя і бачыць не проста пароду, але і перспектывы развіцця ўсёй нафтавай галіны Беларусі.

— Тут захоўваецца 34 тысячы пагонных метраў керну, які мы скрупулёзна збіралі практычна з усёй Беларусі, — гаворыць **намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання «Беларуснафта» Пётр ПОЎЖЫК.** — Ён падняты са свідравін рознай глыбіні. Мінімальная — 2-3 кіламетры, а максімальная — да 7 кіламетраў. Аналагаў гэтаму цэнтру няшмат нават на постсавецкай прасторы. Найбліжэйшыя з іх знаходзяцца ў Томску, Цюмені, Ханты-Мансійску і ў Маскоўскай вобласці.

**Геолаг Ганна ЯРАШЭНКА** расказвае пра гісторыю пошукаў вуглевадароднай сыравіны на тэрыторыі Беларусі. Аказваецца, яе калегі яшчэ ў 1941 годзе дакладна пацвердзілі, што нафта на тэрыторыі рэспублікі ёсць. Першая свідравіна была прабурана ў Даманавіцкім раёне. Да гэтай тэмы вярнуліся толькі праз 20 гадоў: у 1961 годзе прабурылі першую пошукава-разведачную свідравіну. А свідравіна Рэчыцкая № 8 лічыцца першай, з якой нафта пачала здабывацца прамыслова. Адбылося гэта, дарэчы, у 1965 годзе. Максімальная здабыча прыпадае на 1975 год — каля 8 млн тон чорнага золата.

— Сёння на тэрыторыі Беларусі ёсць 15 свідравінмільённіц, — працягвае Ганна Ярашэнка. — Дзевяць з іх і цяпер даюць з нетраў вуглевадароды. Беларуская нафта знаходзіцца глыбока. Нашы спецыялісты маюць вопыт здабычы з глыбіні больш за чатыры тысячы метраў.

Камяні ў Цэнтры апрацоўкі, даследавання і захоўвання керну не проста раскладаюць у адмысловыя скрыні сіняга колеру. Дарэчы, гэтыя каробкі абараняюць вялізныя кавалкі пароды ад вільгаці і агню. Ну а цэплаізаляцыйны ўшчыльняльнік неабходны для дадатковай фіксацыі — каб лішні раз не пашкодзіліся, расказвае **адказны за кернахранілішча геолаг Рустам КАЗІМАЎ:**

— Па сутнасці, гэта геалагічны банк даных. Сёння тут 34 тысячы пагонных метраў, прабураных на 1450 свідравінах. Керн сістэматызаваны, каталагізаваны і пакладзены на доўгачасовае захоўванне на спецыяльныя стэлажы — згодна з геалагічным раянаваннем па зонах нафтагазанакаплення.

Вага такой скрыні залежыць ад шчыльнасці пароды і складае ад 10 да 20 кілаграмаў. На кожнай — QR-код. Сучасныя тэхналогіі дазваляюць імгненна «прачытаць» усё змесціва: дзе, што і калі здабыта. «Цяплічныя» ўмовы для керну — гэта і пастаянная тэмпература. У хранілішчы заўсёды ад 18 да 21 градуса.

Але ж захоўванне керну — не самамэта. Кускі каменнай пароды заўсёды знаходзяцца ў рабоце. На другім паверсе ў лабараторыі літалогіі вядуцца дэталёвыя даследаванні. **Спецыяліст цэнтра Яўгеній НАПРЭЕНКА** каменчыкі бачыць наскрозь:

— Вось у гэтай пародзе — адбітак норкі чарвяка, які жыў прыкладна 360 мільёнаў гадоў таму. Чарвякі, відаць, любілі тое мелкае мора, якое было некалі на гэтай тэрыторыі. Вось тут можна пабачыць вуглефікаваныя астаткі старажытных раслін.



Геолаг Рустам КАЗІМАЎ.

Гэта — пясчанік. Ён з'яўляецца пародай-калектарам, якая найбольш перспектыўная для здабычы вуглевадародаў.

Прыемна, канешне, уявіць, што на тэрыторыі Беларусі 350—370 мільёнаў гадоў таму было мора, падобнае на Чырвонае. І клімат такі ж.

Менавіта тады з рыфавых масіваў сфарміраваліся тыя пароды, якія сёння з'яўляюцца ўнікальным калектарам вуглевадародаў.

**Ірына БАБКОВА, вядучы інжынер службы фізікі пласта,** спачатку займаецца ачысткай кернаў ад вуглевадародаў. Для гэтага «варыць» спецыяльна прыгатаваныя цыліндрыкі з керну ў гарачым растваральніку пры тэмпературы кіпення.

— Так мы вызначаем фільтрацыйныя ўласцівасці — гэта значыць, здольнасць пароды прапускаць нейкія прымесі: газ, нафту, пластавую ваду. Такім чынам адбываецца ацэнка пранікальнасці пласта і вызначаецца ёмістасць калектара.

Побач **інжынер службы фізікі пласта Наталля ФЕДАРЭНКА** вывучае рэчыўны склад парод. Яна займаецца размолам камянёў, іх сушкай і прасейваннем праз спецыяльныя сіты. Для ўсіх гэтых працэдур ёсць самае сучаснае абсталяванне.

У лабараторыі вырабу петраграфічных шліфоў **інжынер службы фізікі пласта Марына ПРОЦКАЯ** паказвае, як робіцца тонкі зрэз пароды таўшчынёй 0,2 мм. Гэта і ёсць шліф:

— Камень доўга апрацоўваюць з дапамогай спецыяльных рэагентаў. Потым ідзе ручная даводка і паліроўка. На кожны ўзор наносіцца інфармацыя пра структурныя асаблівасці: поры, каверны, расколіны.

Усе гэтыя маніпуляцыі з кернам даюць магчымасць спецыялістам-літолагам дабытую інфармацыю сінтэзаваць і супастаўляць.

— Мы складаем дыяграмы генеральнага складу пароды, — расказвае **спецыяліст-літолаг Яўгеній КАЛЕЙЧЫК** і паказвае карту, на якой жоўтым колерам вызначаны мясціны, дзе могуць быць найбольш спрыяльныя для знаходжання нафты пароды. — Такія карты дапамагаюць пры пошукавых геолагаразведачных работах і пры дарасапрацоўцы і даразведцы дзейных залежаў. А вось тут у нас калекцыя розных парод — каля 200 узораў. Яна характарызуе прадукцыйныя і непрадукцыйныя гарызонты Прыпяцкага прагібу.

**Прыпяцкі прагіб — буйная тэктанічная структура Усходне-Еўрапейскай платформы. Размешаны на поўдні і паўднёвым усходзе Беларусі. Яго працягласць 280 км, шырыня да 150 км. З адкладамі Прыпяцкай упадзіны звязаны радовішчы нафты, каменнай і калійных солей, каменных і бурых вугалёў, гаручых сланцаў, прэсных, мінералізаваных і тэрмальных вод, будаўнічых матэрыялаў...**

Менавіта такія комплексныя даследаванні дазваляюць ацаніць перспектывы нафтаноснасці той ці іншай тэрыторыі, падкрэслівае **намеснік дырэктара па геолагаразведачных работах Беларускага навукова-даследчага і праектнага інстытута нафты Барыс ДУБІНІН:**

— Магчыма, знешне работа геолага-літолага не вельмі эфектная, але менавіта яна дазваляе спрагназаваць месцазнаходжанне новых радовішчаў і атрымаць інфармацыю па павялічэнні здабычы вуглевадародаў.

Дарэчы, вытворчае аб'яднанне «Беларуснафта» сёлета плануе павялічыць на 60 % у параўнанні з леташнімі паказчыкамі ўзровень пошукава-разведачнага свідравання. **Намеснік генеральнага дырэктара аб'яднання Пётр ПОЎЖЫК** кажа, што прадпрыемства пастаянна нарошчвае аб'ёмы геолага-разведачных работ:

— Задача наступнага года: нарасціць метраж пошукава-разведачнага свідравання да 32—33 тысяч пагонных метраў. Упершыню на прадпрыемстве пастаўлена яшчэ адна амбіцыйная задача: кампенсаваць на 100 % узровень гадавой здабычы нафты за кошт прыросту запасаў — гэта 1 мільён 670 тысяч тон. Летась атрымалася выйсці па гэтым паказчыку на 85 %. Мы сёння працуем з заказчыкамі з Расіі, Украіны, Індыі, Эквадора, Венесуэлы. Адна з сучасных задач — нарошчванне экспартнага патэнцыялу Цэнтра апрацоўкі, даследавання і захоўвання керну.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**





Керн.



# СВЯТА ВЫСОКАЙ ПАВАГІ ДА СЛОВА

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

З Днём ведаў вучняў павіншаваў **міністр інфармацыі краіны Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ**. Ён пажадаў юнаму пакаленню ісці ў вялікі свет з павагай да бацькоўскага дома, да таго месца, дзе нарадзіліся, пры гэтым застаючыся ўважлівымі да роднага слова, да нацыянальнай літаратуры.

Адметнай падзеяй суботы стала таксама правядзенне міжнароднага круглага стала з удзелам беларускіх і замежных пісьменнікаў «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго», які прайшоў у Варанцэвічах, у раённым музейным комплексе імя Напалеона Орды.

А ў дзень асноўнага святкавання многія павільёны плошчы, дзе праходзіў Фестываль кнігі і прэсы, сабралі на сваіх імпрэзах дзясяткі дзяцей. Тут жа чыталіся апавяданні і казкі, праходзілі конкурсы. У павільён Выдавецкага дома «Звязда» таксама зазіралі малыя наведвальнікі. А многія юныя гледачы, што прыйшлі з бацькамі ў глядзельную залу пад адкрытым небам асноўнага мерапрыемства свята, трымалі сцяжкі і іншыя падарункі ад «Звязды».

Дзень пісьменства 2 верасня пачаўся з адкрыцця памятнага знака «Янава слова». Па традыцыі першым гасцей прывітаў гаспадар — **старшыня Іванаўскага райвыканкама Юрый БІСУН**. Кіраўнік раёна выказаў вялікую падзяку тым, хто рыхтаваў горад да гэтай падзеі, хто плённа папрацаваў, і тым, хто прыехаў на святкаванне. Міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч пажадаў удзельнікам свята высокай павагі да слова, да беларускай культуры, асветніцтва, падкрэсліўшы: «Мы заўсёды жылі ў міралюбстве, у згодзе з самымі рознымі народамі. Хацелася б, каб слова спрыяла гэтым памкненням». Сведчаннем таму, свайго роду ілюстрацыяй да сказанага можа служыць круглы стол беларускіх і замежных пісьменнікаў, які прайшоў у Варацэвічах, на малой радзіме знакамітага мастака, кампазітара, літаратара Напалеона Орды, якога не раз згадвалі падчас святкавання.

Афіцыйная цырымонія адкрыцця XXV Дня пісьменства адбылася на галоўнай сцэне ў гарадскім парку. Віншаванне Прэзідэнта краіны гасцям і ўдзельнікам свята зачытаў **намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА.**

«Гэтае свята — знакавая падзея ў культурным жыцці краіны, сведчанне красы і сілы беларускай мовы, духоўных традыцый нашага народа, — гаворыцца ў віншаванні. — Многія стагоддзі пісьмовае слова перадае з пакалення ў пакаленне вечныя ідэалы прыгажосці, дабра і справядлівасці, з'яўляецца жыватворнай крыніцай мудрасці і ведаў, надзейным спадарожнікам кожнага чалавека на яго жыццёвым шляху.

Продкі пакінулі нам неацэнны скарб — родную мову, выдатнымі ўзорамі якой з'яўляюцца творы Францішка Багушэвіча і Максіма Багдановіча, Янкі Купалы і Якуба Коласа, Уладзіміра Караткевіча і Івана Мележа».

Кіраўнік краіны выказаў упэўненасць, што, зберагаючы спадчыну, сённяшняе пакаленне беларусаў сваёй плённай стваральнай працай будзе ўмацоўваць суверэнітэт і незалежнасць Радзімы.

**Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС** у вітальным слове падкрэсліў, што на гэтай зямлі нарадзіліся і тварылі многія вядомыя дзеячы культуры і мастацтва. Ды і наогул на Палессі жывуць працавітыя і таленавітыя людзі. Таму адрас сённяшняга свята выбраны правільна.







Нязменнай часткай Дня беларускага пісьменства з'яўляецца рэспубліканская навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да святыняў». Яе ўдзельнікі прыбылі ў Іванава 1 верасня, а каля школы № 4 яны высадзілі Сад Малітвы. Прывітальны адрас ад **Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Паўла, Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі зачытаў епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Веніямін.** Тэатралізаванае дзейства, якое прадоўжыла афіцыйнае адкрыццё, называлася «Малой радзіме пакланюся» — сюды ўдала былі ўплецены песні і танцы беларускіх артыстаў. Купалаўцы, напрыклад, паказалі фрагмент з «Пінскай шляхты», які надзвычай лаканічна ўпісаўся ў мясцовую тэматыку.

Тут жа, на галоўнай сцэне свята, адбылося ўшанаванне пераможцаў рэспубліканскага конкурсу «Нацыянальная літаратурная прэмія» — за творы, напісаныя ў 2017 годзе. У ліку пераможцаў названы Казімір Камейша за зборнік вершаў «Высокі бераг» і Васіль Шырко за кнігу прозы «Я нязваны госць». За найлепшую кнігу публіцыстыкі прэмію атрымала Зінаіда Дудзюк — твор называецца «Пара высокага сонца». На разгляд экспертнай камісіі ў гэтым годзе было прынята 59 кніг. Журы выбірала найлепшы з 51 твора.







Шмат іншых добрых і цікавых кніг сустрэліся са сваімі чытачамі падчас святкавання. Напрыклад, на прэзентацыю кнігі «Драўляныя сакральныя помнікі Берасейшчыны» Валерыя Мароза сабраліся не толькі тыя, хто асабіста ведае аўтара. Фаліянт, які выйшаў у выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», несумненна, узнімае пласт гісторыі рэгіёна, раней не даследаваны альбо даследаваны мала. А прэзентацыя атрымалася кранальна-мілай найперш таму, што аўтар запрасіў на яе жанчын, якія натхнілі яго на работу, — маму і жонку. Больш таго, Валерый расказаў, як яго бабуля Вольга Іванаўна ў далёкім 1964 годзе напісала ліст у Вярхоўны Савет з просьбай не закрываць царкву, бо гэта будзе парушэннем правоў вернікаў. І вясковую настаўніцу паслухалі — не закрылі. У гэтай сітуацыі ўнуку проста наканавана было вывучаць помнікі культавай архітэктуры роднага краю. Высока ацанілі нарысы па гісторыі, археалогіі і культуры Валерыя Мароза **дырэктар выдавецтва Уладзімір АНДРЫЕВІЧ**. А таксама ад выдавецтва прэзентаваў прысутным яшчэ адзін цікавы праект — «Янка Купала на мовах свету».

Нашага песняра-класіка згадвалі на Дні пісьменства не раз. Грамадска-культурная акцыя «Чытаем Купалу разам» прайшла на плошчы Кастрычніка. Аўтар гэтых радкоў пазнаёмілася з самымі актыўнымі яе ўдзельнікамі. **Настаўніца беларускай і англійскай моў з Івацэвічаў Вольга КУЗЬМІНА** ўпэўнена, што Купалу проста нельга не любіць.

— Гэтая любоў у мяне ад мамы, а таксама ад выкладчыкаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, — сказала яна.

А яе цёзка па прозвішчы **Людміла КУЗЬМІНА** зараз наогул жыве ў Аўстраліі. Але там, у далёкіх краях, асабліва праяўляецца сум па родным слове. Гэтым разам яна прывезла нашаму музею Касцюшкі ў Мерачоўшчыне «прывітанне» ў выглядзе сувеніраў ад нацыянальнага парку імя Касцюшкі ў Аўстраліі.

— Родную мову асабліва палюбіла, калі пашчасціла пазнаёміцца з нястомным краязнаўцам, збіральнікам народных скарбаў Алесем Фамічом Зайкам з Івацэвіцкага раёна. А цяпер, калі прыехала дадому на некалькі месяцаў, вядома, паспяшалася на Дзень пісьменства. І Купалавы вершы прачытала ў памяць пра самародка, вясковага інтэлігента Алеся Зайку.

Увечары эстафету святкавання Іванава перадало Слоніму. Да сустрэчы на XXVI Дні беларускага пісьменства!

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*г. Іванава.*

**Падрабязней пра міжнародны круглы стол «Мастацкая літаратура як шлях адзін да аднаго» і пра Нацыянальную літаратурную прэмію чытайце ў наступных нумарах газеты.**

**Фота БелТА, Яўгена ПЯСЕЦКАГА, Яніны ГАРАДЗЕЦКАЙ.**

# ЗАМАХ НА ВЫСОКУЮ НОТУ

## У ноч на 1 верасня вызначыўся прадстаўнік Беларусі на дзіцячым «Еўрабачанні»

**10 фіналістаў і столькі ж артыстаў — спецыяльных гасцей гала-канцэрта, у прамым і пераносным сэнсе гарачая атмасфера ў тэлестудыі, сучасныя спецэфекты і тэхнічныя непаладкі, значныя разыходжанні ў ацэнках гледачоў і прафесійнага журы — выбар пераможцы нацыянальнага адбору на міжнародны дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2018» праходзіў, шчыра скажам, напружана і трымаў інтрыгу да апошняга акорда.**


Яраслаў Саколікаў.

Зрэшты, яшчэ задоўга да фіналу было зразумела, што «музычная бітва» чакаецца неабыякавая. І я маю на ўвазе нават не дзяцей, у кожнага з якіх за плячыма рэспубліканскія і міжнародныя творчыя конкурсы ды шматлікія тытулы. Рэч у іншым. Яшчэ падчас праслухоўвання прэтэндэнтаў выявілася: «самародкам з глыбінкі» вельмі цяжка годна канкураваць з выхаванцамі сталічных музычных студый і вучнямі «зорных» педагогаў. **Мастацкі кіраўнік Нацыянальнага цэнтра музычнага мастацтва імя У. Мулявіна Святлана Стацэнка** (не толькі вопытны педагог, але яшчэ і мама першай беларускай пераможцы дзіцячага «Еўрабачання» Ксеніі Сітнік) тады падзялілася меркаваннем, што нічога страшнага ў гэтым няма, нават наадварот: маўляў, адбор выразна паказвае клас таго ці іншага прадзюсарскага цэнтра, майстэрства педагогаў па вакале, уменне правільна падабраць вобраз і рэпертуар. Яно ўсё так, але адбор — прынамсі, сёлетні — не менш выразна прадэманстраваў і тое, у каго з бацькоў таленавітых дзяцей фінансавыя магчымасці дазваляюць заказаць песню за некалькі тысяч долараў і аплаціць паслугі прафесійнага аранжыроўшчыка, набыць у моднага дызайнера сцэнічныя ўборы для юнага артыста і падтанцоўкі, а ў каго дзіця проста ўмее і любіць спяваць ды марыць пра вялікую сцэну.

Ні ў якім разе я не заклікаю занікаць творчую планку і прапускаць наперад слабейшых, але барацьба, з якой некаторыя выбываюць зусім не з-за адсутнасці таленту, падаецца не зусім сумленнай. Тым больш калі гаворка ідзе пра дзяцей.

Але няма правілаў без выключэнняў, і такіх у фінале нацыянальнага адбору на дзіцячае «Еўрабачанне-2018» аказалася два. **Ліза Мея** — таленавітая 10-гадовая дзяўчынка са шматдзетнай жодзінскай сям'і, за спіной якой не праглядваў вядомы прадзюсар, затое на сцэне ў групе падтанцоўкі яе падтрымліваў старэйшы брат, пакуль двое малодшых перажывалі разам з іншымі балельшчыкамі. Лізе і яе педагогу Мілане Вярцінскай хочацца падзякаваць ажно па двух прычынах: па-першае, за беларускамоўную песню «Зорка» (у якой спяваецца, будзеце здзіўлены, не пра імкненне стаць каралевай эстрады, а якраз пра пуцяводную зорку). А па-другое, пры пэўнай шурпатасці нумара ў ім адчувалася галоўнае: шчырасць, не сапсаваная нічымі ўяўленнямі пра тое, «як трэба», і штучнымі прыўкрасамі.

Другой прыемнай нечаканасцю адбору стаў 13-гадовы мінчанін **Мікіта Бялько**, у якога за плячыма — супрацоўніцтва з Валерыем Меладзэ на расійскім тэлепраекце «Голас. Дзеці 5» і ажно чатыры Гран-пры, атрыманыя за год на рэспубліканскіх і міжнародных конкурсах. Пры тым што галоўныя прадзюсары і памочнікі Мікіты — яго мама ды педагог па вакале Васіль Сінько. Праз некалькі гадоў гэты хлопец з пранізлівымі вачыма можа стаць вельмі заўважнай фігурай на беларускай сцэне і ўсіх здзівіць. Гэта, дарэчы, адбылося і падчас сёлетняга адбору: Мікіта выканаў, бадай, самую складаную ў вакальным плане песню і атрымаў у выніку ўсяго 906 галасоў (1 бал) ад гледачоў, затое найвышэйшую адзнаку — 12 — ад журы. Парадокс? «Калі шчыра, то шок, — прызнаўся сам юны артыст у сацыяльных сетках. — Але не трэба адчайвацца, трэба ісці наперад і не здраджваць сваёй мары!»

Што да астатніх фіналістаў, тут спаборнічалі тры вельмі моцныя каманды. Так, у гала-канцэрт трапілі адразу тры вучні Святланы Стацэнкі: 12-гадовы **Арцём Скароль** з Ашмянаў, які сёлета атрымаў 2-ю прэмію на «Славянскім базары ў Віцебску», 13-гадовая **Маша Жыліна**, якая са спалучэннем фальклорнага стылю і рэп-чыткі ўжо трэці раз даходзіць да фіналу нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне», а паралельна збірае мноства прызоў на іншых конкурсах. Нядаўна, напрыклад, прывезла Гран-пры з конкурсу ў Чэхіі і дзіцячага фэсту Сан-Рэма. І самая юная з фіналістаў, але ў сваё дзевяць гадоў вельмі перспектыўная **Маша Гулевіч**. Спявачка і кіраўнік эстраднай студыі StudioPlay Вольга Драздова, якая два мінулыя гады запар рыхтавала да «Еўрабачання» прадстаўнікоў Беларусі (Руслана Асланава і Хелену Мерааі), цяпер прадставіла дзявочы квінтэт **«Мята»**, які перарос у творчую суполку з сяброўства 10—11-гадовых дзяўчат-салістак на групавых вакальных занятках, і 14-гадовага **Даніэля Алекса Ястрэмскага**, за плячыма ў якога леташняе выступленне на дзіцячай «Новай хвалі». Нягледзячы на тое, што хлопец якраз цяпер перажывае мутацыю голасу, педагог вырашыла не адмаўляцца ад шанцаў паўдзельнічаць у прэстыжным міжнародным конкурсе, але працаваць у больш ашчадным рэжыме. Яшчэ дваіх фіналістаў прадставіў прадзюсарскі цэнтр спевака і кампазітара Юзары, які сам мае багаты «еўрабачанскі» вопыт, — сёлета ён напісаў песні ў запамінальным і модным гучанні для **Ангеліны Ярашчук** — спявачкі, балерыны і лінгвістычнага вундэркінда (дзяўчынка вывучае чатыры замежныя мовы і нядаўна, выйграўшы грант Грынвіцкай школы, ездзіла на вучобу ў Вялікабрытанію), і вакальна-танцавальнага гурта **Monkey Tops** (калі вы правялі паралелі з украінскім


Даніэль Ястрэмскі.


Маша Гулевіч.

падлеткавым праектам Open Kids, то маеце рацыю, гэта практычна і ёсць наш яму беларускі адказ: чатыры задорныя дзяўчынкі, у тым ліку ўжо названая Ангеліна). Абавязковая **Яраслава Саколікава**, якая адкрылася на беларускім «Таленце краіны», а два гады таму нарабіў шораху ў расійскім праекце «Голас. Дзеці 2» і дайшоў да фіналу шоу, падтрымлівала яшчэ адна вопытная каманда: прадзюсар і педагог Іна Радаева забяспечвала падапечнаму добры рабочы настрой і пазітыўны піяр, а спявак і кампазітар Макс Лорэнс дапамог з напісаннем песні «Мір на зямлі». І яшчэ некалькі дзясяткаў дзяцей падтрымалі Яраслава проста на сцэне — у відэароліках, дзе вельмі розныя хлопцы і дзяўчаты душэўна выконвалі адну агульную песню.

Улічваючы як ніколі высокі ўзровень канкурэнцыі, дзеці выкладваліся як маглі і нават яшчэ больш. А вось да дарослых ёсць пытанні. Бо гэта з-за іхняга недагляду падчас нацыянальнага адбору адбылася сур'ёзная тэхнічная накладка: у Даніэля Ястрэмскага, які выступаў пад нумарам 2, на пачатку песні адключыўся мікрафон. Таму пасля ўсіх удзельнікаў ён выступіў з песняй Time яшчэ раз. Як растлумачылі вядучыя гала-канцэрта Вольга Рыжыкава і Юрый Вашчук, такая магчымасць прадугледжана правіламі міжнароднага шоу.

Што з усяго гэтага атрымалася? Дыяметральна супрацьлеглыя ацэнкі. У галасаванні гледачоў на першым месцы аказаўся Даніэль Ястрэмскі, які набраў 9237 галасоў, за ім — Марыя Жыліна з 5305 галасамі і гурт «Мята», у якога 4027 галасоў. Далей у табліцы размясціліся Ліза Мея (3853 галасы), Ангеліна Ярашчук (1885), Яраслаў Саколікаў (1778), Арцём Скароль (1629), Марыя Гулевіч (1462), гурт Monkey Tops (1251) і Мікіта Бялько (906). А вось судзейская калегія, у якую ўвайшлі спявачка Наталля Тамела, намеснік начальніка аддзела прафесійнага мастацтва ўпраўлення мастацтваў Міністэрства культуры Тацццяна Пархамовіч, намеснік кіраўніка тэлеканала «Беларусь 1», каардынатар праектаў Белтэлерадыёкампаніі і Еўрапейскага вяшчальнага саюза Вольга Саламаха, тэлевядучы Яўген Перлін, прадзюсар і спявак Алекс Дэвід, спявачка і педагог па вакале Вольга Вронская, а таксама выкладчык універсітэта культуры, былы кіраўнік гурта «Камерата» Ігар Мельнікаў, вырашыла інакш і на першае месца паставіла Мікіту Бялько (12 балаў), на другое — гурт Monkey Tops (10 балаў), на трэцяе — Яраслава Саколікава (8 балаў). Арцём Скароль атрымаў ад журы 7 балаў, Марыя Гулевіч — 6, Марыя Жыліна — 5, Даніэль Ястрэмскі — 4, Ліза Мея — 3, Ангеліна Ярашчук — 2, гурт «Мята» — 1. У выніку па суме балаў п'едэстал заняў Даніэль Ястрэмскі, а за некалькі крокаў ад яго спыніліся Марыя Жыліна, Яраслаў Саколікаў і Мікіта Бялько.

Трэба зазначыць, што каманда пераможцы правяла сур'ёзную папярэднюю падрыхтоўку, і не толькі ў творчым плане — акрамя прома-туру па 12 беларускіх гарадах, выпусцілі з вядомым айчынным брэндам спецыяльныя гадзіннік з надпісам «Час падкажа» і партыю дызайнерскіх футболак.

Што да самога Даніэля Ястрэмскага, то ён нарадзіўся ў ЗША, аднак цяпер жыве ў Мінску, вучыцца ў адной са сталічных гімназій у 9 класе, мэтанакіравана займаецца вакалам і планує звязаць жыццё з музыкай. У яго за плячыма — кастынг на расійскі «Голас. Дзеці» і ўкраінскі тэлепраект «Украіна мае талент», навучанне ў Маскве ў Акадэміі Ігара Крутога і выступленне на леташнім міжнародным конкурсе «Новая хваля». Ці хопіць гэтага хлопцу, каб выступіць ужывую перад 15-тысячнай аўдыторыяй, прадстаўляючы Беларусь на дзіцячым «Еўрабачанні», якое збярэ 20 краін і пройдзе ў лістападзе ў Мінску? Як гаворыцца ў ягонай песні, час падкажа.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Фота прэс-службы Белтэлерадыёкампаніі.**


Маша Жыліна.

### Калі вярстаўся нумар

**Як стала вядома «Звяздзе», пасля абвяшчэння вынікаў нацыянальнага адбору 18 бацькоў і педагогаў юных артыстаў, якія прымалі ўдзел у адборах 2017 і 2018 гадоў, не пагадзіліся з вынікамі галасавання і звярнуліся ў Белтэлерадыёкампанію з адкрытым лістом. Прадстаўнікі канкурсантаў патрабуюць абнародаваць пратаколы галасавання гледачоў і журы з тлумачэннямі выстаўленых ацэнак паводле крытэрыяў дзіцячага «Еўрабачання», а ў будучыні зрабіць судзейскае галасаванне максімальна адкрытым.**

# Павел НАЛІВАЙКА: «Самая галоўная наша каштоўнасць — людзі»

**У якасці старшыні Асіповіцкага райвыканкама Павел Налівайка ўжо год. Але, у адрозненне ад іншых кіраўнікоў, яму не прыйшлося доўга вывучаць спецыфіку раёна. Ён тут нарадзіўся, а пасля ўніверсітэта вярнуўся ў родны горад і падняўся па службовай лесвіцы з галоўнага інжынера аднаго з буйных прадпрыемстваў спачатку да першага намесніка старшыні райвыканкама, а потым — кіраўніка раёна. Займацца развіццём сваёй малой радзімы гэта, безумоўна, ганарова, але і вельмі адказна.**

— Прыемна адзначыць, што ў раённай адміністрацыі працуюць сумленныя людзі, якія накіраваны на вынік, каманда, адным словам, — кажа старшыня. — Мы зацікаўлены, каб Асіповіцкі край стаў найбольш прывабным для бізнесу, каб сюды з задавальненнем ехалі маладыя спецыялісты, каб дынамічна развіваўся аграпрамысловы комплекс. На тэрыторыі раёна працуе шэраг сучасных прадпрыемстваў, прадукцыя якіх запатрабавана не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Гэта заводы «ТэхнаНіколь», аўтаагрэгатаў, парфюмерна-касметычная фабрыка «Сонца», філіял гродзенскага шклозавода «Ялізава», вядомая кампанія «Алцімед», якая распрацоўвае і вырабляе медыцынскія імпланты еўрапейскага ўзроўню якасці. Можна прыводзіць прыклады і далей, але прасцей сказаць, што кожная вытворчасць працуе на вынік і імкнецца канкурыраваць у сучасных умовах.

**— Асіповічы з кожным годам прыгажэюць, асабліва прывабнымі становяцца сучасныя раёны. З'яўляюцца новыя крамы, месцы адпачынку, спартыўныя аб'екты, жылыя дамы...**

— Нягледзячы на цяжкасці, будаўнічая галіна ў нас сапраўды паказвае добрыя вынікі. Сёння мы з'яўляемся лідарамі па аб'ёме будаўніча-мантажных работ у вобласці. Летась аб'ём складаў 51 мільён рублёў, а сёлета — 55 мільёнаў. Па паўгоддзі выканалі заданне на 20,6 мільёна рублёў. Для такога населенага пункта, як Асіповічы, выдатны паказчык, нават калі гэта разглядаць у маштабах краіны.

Актыўна працуем над знешнім выглядам нашых населеных пунктаў. У Асіповічах перспектыўна развіваецца мікрараён Чарняхоўка. Плануем да канца года ўвесці тут фізкультурна-аздараўленчы комплекс з элементамі аквапарку. У горадзе ёсць адзін басейн, і ён карыстаецца папулярнасцю. З уводам у дзеянне новага комплексу мы зможам яго разгрузіць.

Шмат увагі ўдзяляецца ахове здароўя насельніцтва. Сёлета рыхтуецца да здачы і тэрапеўтычны корпус на 100 ложкаў. Рэканструкцыя старога будынка бальніцы пачыналася яшчэ ў 2010 годзе, але з-за недахопу фінансаў крыху расцягнулася. Каб ісці ў нагу з часам, перагледзелі праектна-каштарысную дакументацыю, прынялі шэраг новых рашэнняў. Гэта крыху адсунула дату ўводу аб'екта, але, спадзяёмся, паўплывае на паляпшэнне якасці.

**— На тэрыторыі Асіповіцкага раёна знаходзяцца ўнікальныя турыстычныя аб'екты. Адна толькі 300-гадовая дуброва ў Жорнаўскім лясніцтве чаго каштуе. Наколькі камфортна адчуваюць сябе ў вашым раёне турысты? І ці ёсць ім дзе прыпыніцца? Часта адбываецца, што ў раёне ёсць што паглядзець, а вось пераначаваць, мякка кажучы, няма дзе.**

— У нас на тэрыторыі раёна працуе 33 аграсядзібы! Па іх колькасці мы ў вобласці першыя. Нашы прыродныя багацці і славутасці заўсёды з'яўляліся прадметам цікавасці для турыстаў. Асіповіцкае вадасховішча і гідраэлектрастанцыя, найбуйнейшы археалагічны помнік раёна Свіслацкае замчышча, дом Яцко — селяніна Базыля, пабудаваны ў пачатку XX стагоддзя, Дараганаўскі краязнаўчы музей, карцінная галерэя народнага мастака Беларусі Уладзіміра Стальмашонка і шмат чаго яшчэ цікавага і ўнікальнага — нам сапраўды ёсць што паказаць. Для аматараў актыўнага адпачынку распрацаваны пяцідзённыя веласіпедныя маршруты па раёне: «Асіповіцкая кругасветка», «Сафары», трохдзённы водны маршрут на байдарках «Шляхам Рагнеды».



Ёсць мясціны, якія вабяць людзей сваёй чысцінёй і намоленасцю. За пяць кіламетраў ад горада знаходзіцца незвычайнае месца пад назвай Прошча. Пасярод лесу цячэ крыніца і стаіць храм. Людзі ідуць туды са сваімі бедамі і радасцямі. Бо шмат каму дапамагае гаючая вада і гарачае слова малітвы. Мы распрацавалі турыстычны маршрут — «Падарожжа да святой крыніцы». І ён запатрабаваны.

**— Дарэчы, сёння ў Расіі вельмі развіты прамысловы турызм. Народ з задавальненнем наведвае прадпрыемствы і з захапленнем назірае, як ствараюцца знаёмыя яму па крамах тавары. Асіповічы, як вы казалі, адзін з найбуйнейшых прамысловых цэнтраў Магілёўскай вобласці, тут працуюць вытворчасці нават унікальныя для краіны...**

— Магчыма, прамысловы турызм у нас не так моцна развіты, як у Расіі, але мы над гэтым працуем. На тэрыторыі раёна знаходзіцца 10 асноўных прамысловых прадпрыемстваў, дзе выкарыстоўваюцца сучасныя падыходы ў рабоце. Там сапраўды ёсць чым уразіцца. Той жа вядомы на ўсю краіну Асіповіцкі завод аўтамабільных агрэгатаў, які выпрабляе ўсю пластыкавую і шклапластыкавую складальную частку для нашай грузавой, пасажырскай і сельскагаспадарчай тэхнікі. Сёння ён працуе па сучасных стандартах, там выкарыстоўваюцца 3D-тэхналогіі. Назіраць за працэсам сапраўды цікава і захапляльна. Не менш уражанняў можна атрымаць, трапіўшы на нашу ГЭС.

**— Сёння ў краіне шмат увагі ўдзяляецца тэме навядзення парадку на зямлі. Робіцца ўсё для таго, каб нашы маленькія населеныя пункты выглядалі сучаснымі і зручнымі для жыцця. Ёсць даручэнне Прэзідэнта аб стварэнні ў кожным раёне «вёскі будучага» накшталт аграгарадка Копысь Аршанскага раёна. Чула, што ў вас гэта рабочы пасёлак Татарка.**

— Так. У пасёлку жыве каля сямісот чалавек, з іх крыху больш за шэсцьдзясят — школьнікі. Тут ёсць музычная школа, ФАП, чыгунка. Летась у снежні ў пасёлак прыйшоў прыродны газ. Укладзена шмат сіл у добраўпарадкаванне гэтага населенага пункта, створаны той падмурак, які паслужыць асновай для далейшага росту. Але самае галоўнае, што псіхалогія жыхароў змянілася. Яны зразумелі, што будучыня іх малой радзімы залежыць у першую чаргу ад іх саміх. Татарка ў нас яшчэ і вельмі цікавы турыстычны аб'ект. Дзякуючы вялікаму тарфяному балоту тут калісьці і з'явіўся пасёлак. У гэтых мясцінах наогул вельмі ўнікальная прырода. Мы нават распрацавалі маршрут «Прыродныя багацці рабочага пасёлка Татарка».

**— Асіповіцкі раён яшчэ і добрая пляцоўка для падрыхтоўкі спартсменаў сусветнага ўзроўню. Дастаткова прыгадаць алімпійскіх чэмпіёнаў братоў Багдановічаў.**

— Летась нашы выхаванцы дасягнулі небывалых вынікаў — 38 медалёў на чэмпіянатах свету і Еўропы, міжнародных спаборніцтвах па плаванні, лёгкай атлетыцы, кікбоксінгу і тайландскаму боксу. Акрамя гэтага, на нашым рахунку 50 узнагарод рэспубліканскіх і абласных чэмпіянатаў па лёгкай атлетыцы, плаванні, баскетболе, гандболе, футболе, шахматах. Думаю, сёлета вынікі будуць не горшыя.

# ДУБРОВА НА ЗАЙЗДРАСЦЬ!

## Асіповіцкую Жорнаўскую эксперыментальную лясную базу добра ведаюць у Беларусі

**На ўсю краіну такіх толькі тры — у Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях. Гэта своеасаблівыя навуковыя цэнтры ляснога ведамства. У Асіповічах, напрыклад, сур'ёзна займаюцца даследаваннем і аднаўленнем дуброў. Вопыт каласальны, эксперыментальнай базе больш за 90 гадоў.**

— У склад нашай базы ўваходзяць Лапіцкае і Жорнаўскае лясніцтвы. Тут мы займаемся апрабаваннем тэхналогіі стварэння і вырошчвання складаных высокапрадукцыйных і ўстойлівых культур дуба чарэшчатага і лістоўніцы еўрапейскай. На сённяшні дзень мы маем больш за 50 навуковых аб'ектаў, якія занесены ў адмысловы рэестр. Яны неаднаразова дэманстраваліся на міжнародных, рэспубліканскіх і абласных канферэнцыях, семінарах і нарадах па розных напрамках лесагаспадарчай навукі і практыкі, — кажа **дырэктар Жорнаўскай эксперыментальнай лясной базы Інстытута лесу НАН Беларусі Руслан КАЗАЧОК.**



На працу ў навуковы аддзел прыходзяць ужо добра падрыхтаваныя спецыялісты, як правіла пасля аспірантуры. Пад кіраўніцтвам прафесіяналаў яны вядуць назіранні, збіраюць важныя для лясной навукі даныя. Да іх паслуг багатая навуковая бібліятэка, сабраная папярэднікамі.

**Загадчыца навуковага аддзела Хрысціна СТАРАЖЫШЫНА** працуе на базе ўжо 10 гадоў, пад кіраўніцтвам свайго тутэйшага настаўніка нават дысертацыю напісала.

— Мы распрацавалі новы спосаб стварэння культур дуба — палоснагрупавы, — кажа яна. — Пры такой схеме гэта культура хутчэй расце, яна больш устойлівая. Мы параўноўваем яе з культурамі, якія ствараюць па тыпавой тэхналогіі, і можам смела сцвярджаць: наша лепшая. Ёсць такая прымаўка, што дуб любіць расці ў футры, але з адкрытай галавой. Наша схема дазваляе стварыць футра на першапачатковым этапе росту, але пры гэтым мы не зацяняем верхавіну. Пры такой пасадцы атрымліваюцца цудоўныя дубровы. Няма тых зараснікаў, якія часта сустракаюцца ў іншых лясгасах. Нашым дубровам ужо больш за 30 гадоў. Кожныя 5-10 гадоў мы глядзім вынікі і параўноўваем іх. А яшчэ арганізоўваем семінары для работнікаў лясной гаспадаркі і навукоўцаў.

Вучоныя працуюць па плане, і галоўная ўвага ўдзяляецца перш за ўсё эксперыментальным пляцоўкам. Спецыялісты вымяраюць асветленасць, кантралююць рост, не дазваляюць цясніць дуб бярозам і асінам. А вось з клёнам і ліпай гэта дрэва вельмі добра сябруе. Ліпа наогул з'яўляецца яго біяагентам, павялічвае прадукцыйнасць. На тэрыторыі базы ёсць спецыяльна створаныя аб'екты, дзе дуб з ліпай суіснуюць ужо на працягу больш чым 80 гадоў.

— Тое, што мы апрабоўваем (у нас гэта ідзе як навуковая распрацоўка), потым укараняецца лясгасамі. Пакуль па дубровах у рэспубліцы ёсць пэўныя праблемы. Спадзяёмся, што дзякуючы нам плошча дуброў павялічыцца. Мы адкрытыя да супрацоўніцтва, — адзначае Хрысціна Старажышына.

Клімат у апошні час змяняецца. Дэкаратыўныя пасадкі туі і іншых ядлоўцавых у горадзе добра прыжываюцца, ці не чакаць нам у будучыні нейкіх кардынальных змен з ляснымі пародамі?

— Тая ж лістоўніца таксама інтрадуцэнт, — супакойвае навуковы работнік. — У нас ёсць добры вопыт па вырошчванні насаджэнняў гэтай пароды. Але гэта дарагі пасадачны матэрыял.

— На тэрыторыі Асіповіцкага раёна лясы на 85 % ліставыя, — дадае дырэктар. — Елкі сапраўды сохнуць, а вось для дуба, алешыны, бярозы, асіны — умовы выдатныя. Але іх таксама трэба даглядаць, асабліва ў першыя гады жыцця. Праводзім адукацыю сярод тых, хто даглядае лес. Апошнім часам больш становіцца доследна-вытворчых лясніцтваў. Мы робім ім дакументы, пашпартызацыю. Яны самі ўжо могуць нейкі доследны аб'ект закласці і прааналізаваць, што трэба для захавання лесу. Мы іх, да таго ж, кансультуем. Што датычыцца дуброў, спецыялістаў, такіх як мы, па іх вырошчванні ў краіне няма. У Жорнаўскім лясніцтве ёсць нават 300-гадовая дуброва — гэта заказнік, адзін з унікальных прыродных аб'ектаў Беларусі. Не захапіцца яго прыгажосцю нельга. Мы падкажам, як стварыць не менш уражальную дуброву на сваёй тэрыторыі.

УНП 700164686



# «ВОДАКАНАЛ», ЯКІ ПАБУДАВАЎ... АЗДАРАЎЛЕНЧЫ КОМПЛЕКС



ФАК плануецца здаць ужо сёлета.

**Вось такі, уявіце сабе, парадокс. Асіповіцкае прадпрыемства, якое займаецца водазабеспячэннем і водаадвядзеннем, выступае яшчэ і як будаўнічая арганізацыя. Прычым самая буйная ў раёне. Зараз вось завяршаюцца работы на фізкультурна-аздараўленчым комплексе з басейнам і элементамі аквапарка па вуліцы Юбілейнай. Плануецца, што да канца года ФАК будзе ўведзены ў эксплуатацыю.**

## ЗНАКАВЫЯ АБ'ЕКТЫ



Гэтай хвіліны ў Асіповічах чакаюць, напэўна, усе. Горад дастаткова спартыўны, адпаведныя аб'екты не пустуюць, а пакуль адзіны на ўвесь райцэнтр басейн загружаны пад завязку. ФАК дазволіць зняць градус напружання. Чакаць засталося нядоўга. Дарэчы, спартыўны аб'ект з'явіўся дзякуючы партнёрству мясцовага райвыканкама з Газпрамам: кампанія на 80 % фінансавала будаўніцтва. Сваю долю ў такі важны для насельніцтва аб'ект унёс і Магілёўскі аблвыканкам. У сувязі з тым, што праект быў перагледжаны і з'явіліся некаторыя змяненні, будаўніцтва падаражала на мільён рублёў. Зараз гэта сума паступіла і ўнутраныя работы працягваюцца. «Плануем да канца верасня закончыць», — аптымістычна кажа **дырэктар асіповіцкага прадпрыемства «Водаканал» Дзмітрый БЕЛЫ.**

Афіцыйна Водаканал у такім выглядзе, які ён зараз ёсць, з будаўнічым ухілам, арганізаваны ў 2006 годзе. Да гэтага ён перажыў шмат розных рэарганізацый.

Сацыяльныя аб'екты, узведзеныя прадпрыемствам, сталі ўпрыгажэннем Асіповіч.

Самі спецыялісты накont сваёй будаўнічай спецыфікі жартуюць, што былі першыя, калі іх прадпрыемства лічылася ўнікальным у гэтым сэнсе не толькі ў маштабах вобласці, але і, напэўна, рэспублікі.

— У самы пік будаўніцтва, 2011—2013 гады, колькасць будаўнікоў у нашай арганізацыі даходзіла нават да 200 чалавек, — кажа дырэктар. — Мы былі генпадрадчыкамі (цяпер гэта права ўступілі іншым) будаўніцтва тэрапеўтычнага корпуса ў Асіповічах на 100 ложкаў. Вельмі вялікі аб'ект, тры пускавыя комплексы. Два з іх пабудаваны намі і ўжо паспяхова функцыянуюць. Зараз завяршаюцца работы на трэцім. Максімальна аб'ект фінансуецца два апошнія гады, а наогул будаўніцтва вядзецца з 2010-га.

## ЧЫСТАЯ ВАДА

У Асіповічах збіраюцца ў найбліжэйшы час істотна павысіць якасць пітной вады.

— У нас усяго тры станцыі абезжалезвання на раён, — удакладняе дырэктар. — І гэта пры тым, што мы абслугоўваем 35 населеных пунктаў і горад. Асіповіцкая станцыя забяспечвае горад на 42 % чыстай вадой ад агульнага аб'ёму.

Цяпер прадпрыемства імкнецца трапіць у праграму Сусветнага банка, з дапамогай якога плануе палепшыць справы ў гэтым кірунку. Па-першае, гэта дасць магчымасць пабудаваць станцыю абезжалезвання на водазаборы «Паўночны», што дазволіць забяспечыць чыстай вадой горад на ўсе 100 %. Па-другое, узвесці ачышчальныя збудаванні ў пасёлку Ялізава — пасля райцэнтра гэта самы буйны населены пункт у раёне. Патрэцяе, зрабіць капітальны рамонт каналізацыйнага самацёчнага калектара ў горадзе. На ім ужо адбыліся дзве буйныя аварыі — сітуацыя вельмі крытычная. Па-чацвёртае, зрабіць на ачышчальных збудаваннях рэканструкцыю з устаноўкай абсталявання для азанавання сцёкаў, каб выключыць любую магчымасць скідвання неачышчаных вод у раку.



Добраўпарадкаванне для прадпрыемства — не апошняя тэма.

Трэба аддаць належнае асіповіцкаму Водаканалу: якасць пітной вады тут на асаблівым кантролі. Пры прадпрыемстве працуе аналітычная лабараторыя, якая праводзіць яе аналіз па ўсіх крыніцах — цэнтралізаваных і нецэнтралізаваных. На балансе прадпрыемства знаходзіцца яшчэ і 200 шахтавых калодзежаў, якія перадалі сель-Саветы. Плюс лабараторыя праводзіць штодзённы кантроль паступаючых і ачышчаных сцёкавых вод.

— Не ўсе прадпрыемствы водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі могуць пахваліцца такой лабараторыяй, — падкрэслівае дырэктар. — Калі б у нас яе не было, нам бы прыйшлося наймаць старонюю арганізацыю і штодзённа плаціць грошы за паслугі.

## ЗРАБІЛІ РЭВІЗІЮ

За перыяд свайго існавання прадпрыемства правяло шмат работ па замене абсталявання на ачышчальных збудаваннях, станцыі перапампоўвання сцёкаў і галоўнай КПС горада. Працягваецца пераасначэнне на некаторых іншых аб'ектах. Усё неабходнае для гэтага ўжо закуплена. Спецыялістамі праведзены дасканалы аналіз усяго таго, што перашкаджае працаваць больш плённа. Узяць, напрыклад, цэх жалезабетонных вырабаў. Ён быў задуманы для забеспячэння сваіх патрэб у такой прадукцыі і рэалізацыі яе іншым юрыдычным і фізічным асобам.

— Зараз мы перагледзелі падыходы да яго работы і спадзяемся мець з гэтага прыбытак, — удакладняе дырэктар. — Летам на жалезабетонныя вырабы попыт ёсць заўсёды, а восень зімой працэс запавольваецца. Будзем пераводзіць людзей на іншыя ўчасткі работы і гэтым пазбягаць страты.

Вырашана адмовіцца ад дрэваапрацоўчага цэха, паколькі купляць дошкі ў мясцовым лясгасе ўсё ж такі танней. Будзе таксама перагледжаны транспартны парк. Набор тэхнікі, улічваючы, што тут працуе будаўнічы ўчастак, значна больш, чым у іншых аналагічных прадпрыемствах, — 70 адзінак з прычэпамі.

## ЗНІЖАЕМ ЗАТРАТЫ І ЎКАРАНЯЕМ СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

Сучасныя тэхналогіі даюць магчымасць зрабіць працу лягчэйшай і аптымізаваць выдаткі. Пазалетась на каналізацыйных помпавых станцыях прадпрыемствам была зроблена дыспетчарызацыя. Дзякуючы гэтаму стала магчыма хутчэй рэагаваць на негатыўныя сітуацыі. Устаноўлена аўтаматызаваная сістэма кіравання водазаборамі. У планах пры будаўніцтве новай станцыі абезжалезвання ў Асіповічах аўтаматызаваць усю сістэму водазабеспячэння горада.

Пры аказанні паслуг, эксплуатацыі, будаўніцтве на прадпрыемстве рупна падлічваюць, дзе і як можна знізіць затраты.

— Станцыя абезжалезвання, якую мы запусцілі ў 2015 годзе, па праекце першапачаткова «каштавала» 13 мільярдаў рублёў старымі грашыма, а мы пабудавалі за дзевяць, — прыводзіць прыклад Дзмітрый Белы. — Зніжэння дабіліся за кошт аптымізацыі і карэкціроўкі праектных рашэнняў. Выключылі шмат чаго лішняга, што ніяк не паўплывала на работу станцыі. Плюс будуем гаспадарчым спосабам. За апошнія тры гады пабудавалі таксама чатыры кіламетры водаправодаў цэнтральных вулічных сетак і каля 1,5 кіламетра каналізацыі.

## ДЛЯ АДНАЎЛЕННЯ СІЛ

Улічваючы, што праца цяжкая і напружаная, на прадпрыемстве стварылі выдатныя ўмовы для аднаўлення сіл сваім работнікам. Пры Водаканале функцыянуе фізкультурна-аздараўленчы комплекс, дзе ёсць трэнажорная зала, абсталяванне для гульні ў настольны тэніс, душавыя, більярдная, пакой для адпачынку. Пасля спартыўных заняткаў быццам зноў на свет нарадзіўся. Напэўна, таму на прадпрыемстве працуе так шмат аптымістаў. Да цяжкасцяў тут ставяцца як да часовай перашкоды, якую трэба пераадолець і рухацца як мага хутчэй наперад.

УНП 790019520

# НА КАРЫСЦЬ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

**Асіповіцкае УКП «ЖКГ» працуе над стварэннем «вёскі будучага» і ўкараняе сучасныя тэхналогіі.**

Сёння пытанні эканоміі ў краіне ў цэнтры ўвагі. Асабліва што датычыцца камунальных паслуг. Ну хто з нас зімой не войкаў ад лічбаў за цеплаэнергію? Па сутнасці, яны вельмі добра характарызуюць стан цеплагаспадаркі асобнага пастаўшчыка гэтай паслугі. Калі ён паклапаціўся, каб сістэма працавала менш стратна, тады і сумы для спажыўца больш прыемныя. Вя ўпраўленні ЖКГ Магілёўскага аблвыканкама пра Асіповіцкае УКП адзываюцца як аб адным з найлепшых. Вось і зараз яны прапануюць адзін з прагрэсіўных на сённяшні дзень спосабаў вырабу цеплавой энергіі — на шчэпках з падачай паліва ў аўтаматычным рэжыме і дыспетчарызацыяй. Такіх кацельных у вобласці пакуль адзінкі.

## САМІ РАСПРАЦАВАЛІ, САМІ ЗРАБІЛІ

Рэканструкцыя кацельнай аграгарадка Вяззе з заменай газавых катлоў на катлы, якія будуць працаваць на мясцовых відах паліва, у разгары. Ужо змантаравана практычна ўсё асноўнае кацельнае абсталяванне.

— Да 1 кастрычніка, спадзяёмся, наладзім падачу паліва на гэтай кацельнай, — дзеліцца планамі **начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела УКП «ЖКГ» Таццяна БЫЛІНА.** — Яна будзе адбывацца аўтаматычна без удзелу персаналу. Гэта робіцца з мэтай зніжэння сабекошту адной гігакалорыі. Пры рабоце на газе яе кошт складае 160 рублёў, а пры рабоце на шчэпках у аўтаматычным рэжыме плануецца, што будзе каштаваць 92 рублі. Эканомія атрымліваецца за кошт адсутнасці абслуговага персаналу. Бо заработная плата ў агульным аб'ёме затрат складае ад 15 да 20 %.

Дарэчы, увесь гэты праект ад пачатку да канца зроблены ў сценах УКП. Суразмоўніца дэманструе тоўстыя папкі з чарцяжамі і разлікамі. Гэта праектна-каштарысная дакументацыя, распрацаваная сваімі спецыялістамі. Усё, на чым можна сэканоміць, тут улічана. Рэканструкцыя таксама вядзецца менш затратным шляхам — гаспадарчым спосабам.



Таццяна БЫЛІНА дэманструе праектна-каштарысную дакументацыю на сучасную кацельную.

— Пры будаўніцтве такім чынам эканомія бюджэтных сродкаў складае 20—30 %, — удакладняе начальнік аддзела. — Ёсць, праўда, некаторыя цяжкасці з фінансаваннем. У адрозненне ад падраднага спосабу мы працуем без грашовых паступленняў і не можам браць авансы на набыццё матэрыялаў. Работы вядуцца выключна за ўласныя сродкі. Толькі праз месяц мы маем магчымасць іх забраць. Але мы ўсё роўна ў выйгрышы. На новай кацельнай абслуговага персаналу спатрэбіцца мінімум.

Сёлета новая блочна-модульная кацельная з'явіцца і на базе школы ў аграгарадку Дараганава. Модуль будзе працаваць на пелетах, таксама ў аўтаматычным рэжыме і з дыспетчарызацыяй.

— Усё робіцца з мэтай зніжэння сабекошту, — удакладняе Таццяна Быліна. — На жаль, на пелетах сэканоміць так, як на шчэпках, не атрымаецца. Іх прыходзіцца набываць па дастаткова высокай цане. Але нават з улікам іх дарагавізны такі варыянт найбольш эканомны.

На гэтай кацельнай таксама можна будзе сэканоміць на абслуговым персанале. Працаваць на ёй будзе слесар, які абслугоўвае яшчэ адну дараганаўскую кацельную.

## РАБОТА Ў НОВЫМ ФАРМАЦЕ

Раней Асіповіцкае УКП «ЖКГ» было выключна цеплаэнергетычным прадпрыемствам, але з 2016 года да яго далучылі шмат іншых. У выніку прадпрыемства цяпер адказвае за бягучы і капітальны рамонт жылфонду, тэхнічнае абслугоўванне, вываз цвёрдых камунальных адходаў, збор другасных матэрыяльных рэсурсаў і шмат што іншае. На яго балансе знаходзяцца могілкі, палігон ЦКА. Ёсць нават дзве рытуальныя крамы і ўчастак па вырабе вянкоў.

Пасля рэарганізацыі ў прадпрыемства з'явілася магчымасць аказваць дадатковыя платныя паслугі. Іх тут цэлы спіс, пачынаючы ад замены батарэй, вокнаў, дзвярэй, заканчваючы афарбоўкай, электрыкай. Для юрыдычных асоб выконваюцца сантэхнічныя, электрамантажныя, праектныя і рамонтна-будаўнічыя работы. УКП сёння прапаноўвае гасцінічныя паслугі, выраблае аконныя блокі, абслугоўвае вулічна-дарожную сетку.



Кіраўнік прадпрыемства Дзмітрый КУЛАКОЎСКІ.

— Лягчэй сказаць, чаго мы не робім, — усміхаецца **начальнік планава-эканамічнага аддзела Таццяна САФОНЦАВА.** — Акрамя водазабеспячэння, здаецца, усё. Як той казаў, любы капрыз — за вашы грошы. Нашы паслугі на некалькі лістоў распісаны. Мы і самі сэканомілі на паслугах, якіх раней у нас не было, і мы іх заказвалі. Працуем з поўнай самааддачай. Рэнтабельнасць ад работы прадпрыемства за паўгода склала 6,9 % (летась была 5,9). Але даходная частка ўсё роўна пакуль вымушае жадаць лепшага. Прыбытак прыносіць толькі цеплавая энергія. Што датычыцца астатняга, работы даводзіцца выконваць за ўласныя сродкі. А іх на ўсё не хапае. Балючым пытаннем застаюцца дарогі. Але прадпрыемства штодзённа працуе над пытаннем па зніжэнні затрат.

На сённяшні дзень сярэдняспісачная колькасць працуючых ва УКП «ЖКГ» складае 739 чалавек. У параўнанні з мінулым годам іх стала меней на 36 чалавек. Тая ж аўтаматызаваная кацельная дазваляе паменшыць колькасць абслугоўваючага персаналу на 5-6 работнікаў. Аптымізацыя адбываецца галоўным чынам з-за сыходу на адпачынак пенсіянераў.

Адзін са спосабаў зніжэння страт — замена цеплавых сетак. Штогод атрымліваецца замяніць 4 % трубапровада ад яго агульнай працягласці. Гэта прыкладна 5-6 кіламетраў на год. На пачатак жніўня ў Асіповічах было заменена каля 2 кіламетраў цеплавых сетак, яшчэ 1,5 кіламетра знаходзіцца ў стадыі замены. У планах прадпрыемства да канца года дасягнуць запаветнай лічбы — знізіць цеплавыя страты да 11 %.

## АКЦЭНТ НА ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

Сёння частка работнікаў УКП працуе ў пасёлку Татарка, дзе ствараецца так званая вёска будучага. На прыдамавых тэрыторыях уладкоўваюцца пешаходныя дарожкі і праезды, прыводзіцца ў належны стан вулічнае абсталяванне, устанаўліваюцца дзіцячыя гульнявыя атракцыёны — іх купілі за сродкі, прадугледжаныя абласной праграмай. Фарбуюцца фасады дамоў, робіцца адмосткі — пасёлак прыгажэе на вачах.

— Работы вядуцца з чэрвеня і пад пільным кантролем мясцовай улады, — удакладняе **намеснік дырэктара УКП «ЖКГ» Міхаіл БЕЛЫ.** — Раз на месяц у Татарцы праводзяцца нарады з удзелам прадстаўнікоў раённай і абласной улады. Выказваюцца заўвагі, карэктуецца працоўны працэс. Гэта вельмі важны для нас аб'ект і адказны, бо працаваць на карысць сваёй малой радзімы заўсёды прыемна. Пасля Татаркі возьмемся наводзіць парадак у пасёлку Ялізава. Гэта два населеныя пункты, якія маюць вялікую гісторыю і адыгрываюць у жыцці Асіповіцкага краю вельмі важную ролю.

УНП 700028635

# НОВАЕ ЖЫЦЦЁ ЯЛІЗАЎСКАГА СЛОІКА

**Сёння ялізаўскі шкляны завод зноў працуе на поўную магутнасць. Прадпрыемства, якое апошнія два гады знаходзілася ў стадыі банкруцтва, атрымала новае жыццё. Зараз гэта філіял Гродзенскага шклозавода. Лета — гарачая пара, слоікі нарасхват. Кансервуюць і хатнія гаспадыні, і заводы. Попыт на бутэльку не меншы, яна таксама доўга на складзе не затрымліваецца. Наколькі тут выпускаюць запатрабаваны тавар, відаць і па чарзе з грузавікоў. Бывае адначасова па 40 і болей машын.**

## ПА ЕЎРАПЕЙСКІХ СТАНДАРТАХ

— Пад назвай «Гродзенскі шклозавод «Філіял Ялізава» мы працуем з мая гэтага года, — расказвае **дырэктар Дзяніс ЮРЧАНКА.** — Дзякуючы гродзенскаму вытворцу завод нават ні на хвіліну не прыпыніў сваю работу. Усе яго работнікі — а гэта 520 чалавек — былі прыняты па кантрактах на «Філіял Ялізава».



**Дырэктар Дзяніс ЮРЧАНКА: «Мы гатовы разглядзець любыя вашы прапановы»**

Завод выпускае каля 120 відаў слоікаў і бутэлек. Намінал слоікаў ад 100 грамаў да двух літраў, але існуе шмат ахвотных ідэнтыфікаваць свой слой. Атрымліваецца, што слоік па аб'ёме стандартны, але адрозніваецца па надпісе. Таксама і з бутэлькамі. Дастаткова ўспомніць брэнды, якія ўжо на слыху, — «Сваяк», «Бульбаш», «Крышталь» і гэтак далей.

На сцяне дырэктарскага кабінета міжнародныя сертыфікаты — прадпрыемства актыўна пастаўляе сваю прадукцыю ў краіны Прыбалтыкі, Польшчу, Украіну. Але перш за ўсё тут імкнуцца запоўніць беларускі рынак. Завод у Ялізава — адзіны ў краіне вытворца слоікаў. І адзіны, хто выпускае прадукцыю з белага шкла. Гродна, напрыклад, спецыялізуецца на зялёным шкле, Гомель — на карычневым.

З 10 мая філіял пачаў самастойна шукаць рынкі збыту, тут адкрыўся аддзел продажу, якога раней ніколі не было. Ялізаўскую тару рэалізоўвала асобная арганізацыя.

— Мы плануем працаваць непасрэдна са спажыўцом, цалкам адысці ад пасярэдніка, — кажа дырэктар. — А яшчэ збіраемся па максімуме пашырыць радыус рэалізацыі нашай прадукцыі і больш павысіць яе якасць. Аднак і зараз на яе няма нараканняў. Неяк адзін кліент прызнаўся, што наш слоік хоць і даражэйшы ў параўнанні з расійскім, затое праблем у рабоце з ім не ўзнікае.

На завод паступае шмат прапаноў па выпуску шкляных вырабаў, якіх пакуль няма ў асартыменце.

— Мы разглядаем усе прапановы, — адзначае дырэктар. — Наша вытворчасць дастаткова гнуткая. Цяпер вось вырабляем лампады, якія ідуць на Еўропу. Вядуцца перагаворы па вырабе шклянак таго ж Маліноўскага. Калісьці мы іх ужо рабілі.

## МАЙСТРЫ ШКЛЯНОЙ СПРАВЫ

Экскурсія па заводзе — працэс захапляльны. У вялікіх печах пры тэмпературы вышэй за 1500 градусаў з бясформеннай масы нараджаюцца звыклыя нашаму воку слоікі і бутэлькі.

— Калі змяшаць соду, даламіт, пясок і астатнія кампаненты, атрымліваецца шыхта — асноўны матэрыял для вырабу шкла. Плюс дадаецца каля 40 % шклабою. Ён больш легкаплаўкі, і трэба меней газу, каб шыхта плавілася, — інструктуе па дарозе **намеснік дырэктара па тэхнічных пытаннях Алег ГЕРБАЧ.**

Кіраванне печчу вядзецца ў аўтаматычным рэжыме з аператарскай.



**Алег ГЕРБАЧ дэманструе эксклюзіўны варыянт бутэлькі.**

У Аляксандра Маліноўскага штучная прафесія — ён шклавар, на гэтай пасадзе 12 гадоў. На заводзе працуюць таксама яго бацькі і сястра. Азы прафесіі спасцігаў у расійскім горадзе Гусь-Хрустальны, потым праходзіў стажыроўку на родным прадпрыемстве. Цяпер ён прафесіянал.

Пад наглядам Аляксандра ствараецца шкламаса, з якой потым будзе выдзімацца гатовы прадукт. Гэты працэс таксама цалкам аўтаматызаваны. Пасля шкляны выраб праходзіць загартоўку ў печцы абпальвання і трапляе на транспарцёр. Каб гарачае шкло не трэснула ад рэзкага перападу тэмператур, на яго перыядычна «дыхаюць» полымем. Аператары тым часам наносяць адмысловую змазку на формы, адкуль сходзіць крохкі тавар, каб шкламаса не наліпала на метал. Збоку ўсё гэта выглядае як невялічкае фаер-шоу.

Цікава, што шклаварная печ з моманту запуску не прыпыняецца ні на хвіліну да самага рамонту. А гэта адбываецца прыкладна раз у восем гадоў! За суткі на заводзе выпрацоўваецца 290 тон шкла! І летам гэтага не заўсёды хапае!

У адным з цэхаў Алег Гербач звярнуў увагу на тое, што ён ацяпляецца ад печы абпальвання. У будучым плануецца забяспечваць «пячным» цяплом і гарачай вадой усё прадпрыемства. Гэта дазволіць адмовіцца ад паслуг існуючай кацельнай.

— Налета плануем запусціць цэх, дзе будзем рабіць «аблегчаную» бутэльку па абсалютна новай тэхналогіі. А яшчэ збіраемся мадэрнізаваць цэх упакоўкі, — дзеліцца найбліжэйшымі планамі суразмоўнік.

## БОЛЬШ ЗА СТО ГАДОЎ ГІСТОРЫІ

16 верасня заводу ў Ялізаве спаўняецца 105 гадоў. У тутэйшым музеі захоўваецца ўся яго гісторыя са дня ўтварэння. Цяпер працэс вытворчасці шкляной тары цалкам механізаваны, а раней шкляныя рэчы рабіліся ўручную. Чаго тут толькі не стваралі — чарніліцы, газоўкі, нават мухалоўкі...

— Калісьці ў Ялізаве быў закладзены драўляны палац у гонар Елізаветы Вялікапольскай, а на месцы цяперашняга завода была пабудавана лесапільня, — вяртае ў мінулае **памочнік дырэктара Вольга ГАЛАЦЭВІЧ.** — Шкляны завод запрацаваў тут у 1913 годзе. Гэта месца выбралі таму, што было зручна дастаўляць сыравіну па рацэ. Захаваўся дакумент, які сведчыць пра запуск завода.


Контора
стекольнаго завода „Елизово"
М. И. МЕРЛИСЪ и Н.

**У музеі хапае рэдкіх экспанатаў.**

У музеі можна ўбачыць і шкло, якое выдзімалася больш за 100 гадоў таму. Яно тоўстае і, у адрозненне ад сучаснага, зеленаватага колеру. У 1928 годзе завод выпускаў нават слоікі для крэмаў. Адзін з такіх рарытэтаў прынёс на завод мясцовы жыхар. На вочы трапіў шкляны сіфон. Аказваецца менавіта тут выпускалі папулярныя на ўвесь Савецкі Саюз прыстасаванні для хатняй газіроўкі! Іх яшчэ зараджалі ў спецыяльных пунктах. Ёсць фота з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам, які наведаў прадпрыемства двойчы — у 2002 і 2006 гадах, калі тут запускаліся цэхі. Гэты год таксама выдаўся для ялізаўскага завода знакавы. Яго адраджэнне стала знамянальным і для самога пасёлка. Пятая частка насельніцтва працуе менавіта тут. І шмат хто сем'ямі. Сёння ў іх ёсць цвёрдая ўпэўненасць у будучым. Так што гісторыя працягваецца...

Кантакты аднаго з вядучых вытворцаў шкляных вырабаў у краіне шукайце **(на сайце grodnoglass.by)**

УНП 701485728

# АД ДЭТАЛЯЎ ДА ПРАГУЛАЧНЫХ ЛОДАК

## Асіповіцкі завод аўтамабільных агрэгатаў гатовы да любых эксперыментаў

**З вырабамі гэтага прадпрыемства мы сутыкаемся кожны дзень. Яны ёсць у любой грузавой і сельскагаспадарчай тэхніцы беларускай вытворчасці. Мы кожны дзень карыстаемся імі ў метро і грамадскім транспарце. Іх можна знайсці ў бытавых прыборах, прыстасаваннях для страйкбола і нават плаўсродках. І тавараў з камплектуючымі завода становіцца ўсё больш. Нядаўна на прадпрыемстве пабывалі прадстаўнікі вядомага амерыканскага вытворцы сельскагаспадарчых машын «Джон Дзір». Не выключана, што менавіта асіповіцкія спецыялісты хутка будуць вырабляць нешта для сумеснага з гэтай кампаніяй прадпрыемства.**

### АЎТОБУС БЕЗ НАС — НЕ АЎТОБУС

Асіповіцкі завод аўтаагрэгатаў — прадпрыемства шматпрофільнае. Тут арганізавана работа па пяці кірунках — алюмініевае ліццё, вытворчасць тэрмапластаў, рэактапластаў, вакуумнае фармаванне і механазборачная вытворчасць. Асноўнай прадукцыі завод выпускае да пяці тысяч найменняў, а з улікам таго, што нешта тут робіцца пад заказ, можна налічыць і ўсе 10 тысяч.

— Мы самастойная арганізацыя, але ў якасці даччынай уваходзім у холдынг «Белаўтамаз», — знаёміць з прадпрыемствам **намеснік дырэктара па кадрах, ідэалогіі і сацыяльных пытаннях Андрэй ЧЫГІЛЕЙЧЫК.** — Наш асноўны від дзейнасці — вытворчасць вузлоў і агрэгатаў для грузавой, пасажырскай і сельскагаспадарчай тэхнікі. Галоўны спажывец прадукцыі — МАЗ, туды ідзе пад 80 % нашых вырабаў. Той жа мазаўскі аўтобус без нас — не аўтобус. Усё, што пластыкавае ў ім, а таксама сядзенні, поручні, падлакотнікі, — гэта наша.

Наогул, дзякуючы асіповіцкаму заводу айчынны аўтапрам мае свой твар. «Белкамунмаш», Мінскі метрапалітэн, БелАЗ, МТЗ, «Магілёўтрансмаш», «Гомсельмаш» — у спісе спажыўцоў — лідары беларускага машынабудавання.

Вельмі моцная тут вытворчасць па вырабе дэталяў з пластмас, полідыцыклапентадыену, пенаполіўрэтанаў. Дарэчы, менавіта яна зацікавіла прадстаўнікоў амерыканскай кампаніі «Джон Дзір».

— Спецыялісты азнаёміліся з нашай прадукцыяй, сфармулявалі свае пытанні, і, калі нашы адказы іх задаволяць, не выключана, што яны прапануюць рабіць нам камплектуючыя для іх расійскіх заводаў, — адзначыў **галоўны інжынер прадпрыемства Аляксандр СЕНЧАНКОЎ.**



**Асіповіцкія лодкі запатрабаваны ва Украіне і Казахстане.**

### БІ ТУ БІ І БІ ТУ СІ

Завод працуе, як зараз модна стала выказвацца, па мадэлі «B2B і B2C» — прапануе сваю прадукцыю як прадпрыемствам, так і асобным кліентам. Тон задае аддзел перспектыўнага развіцця. Тут працуюць высокапрафесійныя спецыялісты, якія займаюцца аптымізацыяй вытворчых працэсаў, іх актуалізацыяй, праводзяць арганізацыйна-тэхнічныя мерапрыемствы, аказваюць метадычную дапамогу пры ўкараненні чагосьці новага і перадавога. Трымаць сябе ў форме ім дапамагае супрацоўніцтва з міжнародным інстытутам праблем машынабудавання.

— Збіраемся арганізаваць новы ўчастак па вытворчасці вакуумфармованых дэталяў, — расказвае **намеснік галоўнага інжынера — начальнік аддзела перспектыўнага развіцця Аляксандр Фёдараў** — У нас ідзе мадэрнізацыя ўсёй вытворчасці і стварэнне высокапрадукцыйных рабочых месцаў. Для гэтага мы набываем адмысловае абсталяванне. Калі раней абразалі дэталі ўручную, то сёння гэта будзе рабіць робат. Працуем па спецыялізаваных 3D-праграмах, якія дазваляюць рабіць гэтую справу з дакладнасцю да 0,01 міліметра. Абсталяванне дапаможа нам скараціць тэрмін падрыхтоўкі вытворчасці новых дэталяў з месяцаў да некалькіх дзён.

Тут ужо набылі сканер для зваротнага інжынірынгу. Вельмі неабходная тэхніка, калі ёсць патрэба зрабіць нешта пад заказ.

— Напрыклад, машына трапіла ў аварыю, і паляцела дэталь, якую купіць немагчыма. Шляхам зваротнага інжынірынгу мы атрымаем выяву яе 3D-мадэлі і зможам стварыць копію гэтай дэталі, — тлумачыць суразмоўнік.

### КАНОЭ СПАДАБАЛІСЯ НАВАТ АЛЯКСАНДРУ БАГДАНОВІЧУ

Спартыўныя лодкі на заводзе робяць па даручэнні кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі, тут жа створана адзіная ў краіне лабараторыя па акрэдытацыі гэтай прадукцыі.

— Прапануем лодкі-чацвёркі для акадэмічнага веславання, байдаркі, каноэ, — дэманструе вытворчасць **слесар механазборачных работ Дзмітрый БАБІНА.** — У нас іх заказваюць спартыўныя школы з Украіны, спажыўцы з Казахстана. Маем добрыя водгукі ад спартсменаў і спецыялістаў. Нашы лодкі, дарэчы, аналагі італьянскіх мадэляў. Якасць не горшая, а вось цэны ніжэйшыя. Вядомы беларускі вясляр Аляксандр Багдановіч некалькі разоў бываў у нас і сказаў, што нашы лодкі добрыя і што трэба далей развіваць гэтую вытворчасць.

На ўчастку працуюць дзевяць чалавек. Асноўную работу Дзмітрый выконвае з напарнікам Дзянісам Загароўскім, таксама слесарам. А вось жанчыны — іх тут большасць — фармуюць вырабы, зачышчаюць, наводзяць, як той казаў, глянец.

— Заказчыкам падабаецца, што мы выконваем любы іх капрыз. Фарбуем у той колер, які яны пажадаюць, цалкам пад іх збіраем начынне. Форма пакупная, але ўсё, што на ёй ёсць, — гэта нашых рук справа. Выкарыстоўваем сучасныя матэрыялы, у прыватнасці вугляпластык. Кожная лодка — тавар штучны, а не нейкі там серыйны штамп. За гэтую прадукцыю нам не сорамна, — кажа Дзмітрый.

### НУМАР У ГАСЦІНІЦЫ НЕ ЖАДАЕЦЕ?

Завод працуе не толькі на ўнутраны рынак, але і актыўна прасоўвае сваю прадукцыю на суседнія. Маркетолагі вывучаюць шляхі пашырэння дылерскай сеткі ў Расіі.

— Сёлета мы шмат ездзілі па расійскіх прадпрыемствах, прапаноўвалі наша алюмініевае ліццё. Цяпер чакаем вынікаў, — удакладняе **начальнік бюро маркетынгу Надзея ГАСАН.** — Наогул у нас ёсць шмат чаго, што мы маглі б прапанаваць нашым замежным партнёрам. Дэманструем свае дасягненні на шматлікіх выстаўках і форумах. Летась наш намеснік дырэктара па маркетынгу і камерцыйных пытаннях наведаў чэмпіянат свету па веславанні сярод юніёраў у горадзе Тракай у Літве, расказваў там пра нашы лодкі. А ў верасні ездзіў на чэмпіянат Еўропы па акадэмічным веславанні ў Брэст.

Прадпрыемства зарабляе не толькі сваімі таварамі, але і паслугамі. У адным з самых маладых раёнаў горада знаходзіцца гасцініца прадпрыемства. Якасць, як той казаў, праверана на сабе. Умовы — каралеўскія. Двухпакаёўка з поўным наборам мэблі, халадзільнікам, тэлевізарам, шыкоўным санвузлом, вялізарным ложкам каштуе крыху больш за 30 рублёў за суткі. Дызайн прадуманы да дробязяў: мяккія пастэльныя фарбы, утульныя светлавыя зоны, зручная, функцыянальная мэбля. Адным словам, запамінайце адрас: вуліца 60 год Кастрычніка, 23.

Больш інфармацыі пра прадпрыемства глядзіце ў інтэрнэце **на сайце ozaa.mogilev.by.**

УНП 700078568



**У завода ёсць нават свая гасцініца.**

# З РАЗЛІКАМ НА ФАРЭЛЬ

## Вядучы вытворца айчыннай рыбы збіраецца пашыраць аб'ёмы і павялічваць асартымент

**Асіповіцкі рыбгас «Свіслач» — адна з найбуйнейшых гаспадарак Беларусі, тут рэалізуюць каля 500 тон рыбы ў год. Хутка пачнецца чарговы сезон вялікай рыбы, і на восеньскіх кірмашах да машын рыбгаса зноў будуць выстройвацца вялікія чэргі. Карп, белы амур, таўсталобік, сом, шчупак — тут ёсць усё, што можа задаволіць самы вытанчаны густ. Цана і якасць, як той казаў, адпавядаюць запатрабаванням спажыўцоў.**

Летам тэмп продажу крыху запавольваецца. Гэта якраз той перыяд, калі рыба актыўна набірае вагу. Але перыядычна рыбгас усё ж такі рэалізуе карпа. Яго хоць і няшмат, але ўвесь ён спраўны — адна рыбка важыць пад два кіло.



Рыбка, гатовая да продажу.

— Каб рыба набрала такую вагу, яшчэ трэба пастарацца, — расказвае **галоўны рыбавод рыбгаса Яўген НАВАСЕЛЬЦАЎ.** — Для гэтага неабходна расціць яе 2-3 гады. Пасадачны матэрыял купляем у іншых рыбгасах Беларусі і ўжо з лічынкі вырошчваем спачатку 50-грамовую рыбінку, а потым даганяем яе вагу да некалькіх кілаграмаў. За гэты час мы некалькі разоў мяняем ёй жытло, перасаджваем з адной сажалкі ў другую. Іх, дарэчы, у гаспадарцы каля двух дзясяткаў.

Рыбе, як і любой іншай жывой істоце, патрэбны добры догляд. Плюс — якаснае харчаванне. Набраць неабходныя памеры ёй дапамагаюць айчынныя кармы. Карпы і амуры добра растуць на выrабах гродзенскага вытворцы «Біяком» і аршанскага — «Экамол-агра».

Карысным прадуктам прадпрыемства забяспечвае гандлёвые сеткі ў асноўным найбліжэйшых да Асіповіч раёнаў Магілёўскай, Гомельскай, Мінскай абласцей і Мінска, а таксама самастойна рэалізуе праз выязныя пункты «Жывая рыба». Ёсць магчымасць зарабіць на прадукцыі рыбгаса і ў іншых. Прадпрымальнікі, якія не лянуюцца прыязджаць на сартавальную базу па смачны тавар самастойна, страт не нясуць. Па сабекошце амуры, карпы, таўсталобікі і астатнія жыхары рыбгасаўскіх вадаёмаў абыходзяцца нашмат таннней. Да таго ж не так шмат сёння знойдзецца на геаграфічнай карце экалагічна чыстых месцаў. «Свіслач» ў гэтым сэнсе пашчасціла: і тэрыторыя не забруджаная, і сажалкі пастаянна падсілкоўваюцца свежай вадой з Асіповіцкага вадасховішча. У рыбгасе наогул якасць тавару на першым месцы. Тут шмат увагі ўдзяляецца прафілактыцы захворванняў і падтрымцы





Добры ўлоў.

імунітэту рыбы. Таму яна атрымліваецца тут прыгожая і апетытная, нават смак у яе болей далікатны і сакавіты.

Для рыбакоў ёсць яшчэ адзін спосаб паласавацца смакатой — платная рыбалка. Да паслуг адпачывальнікаў сажалка плошчай больш за 10 гектараў, добраўпарадкаваныя месцы для рыбалкі, утульныя альтанкі і навесы на беразе, мангалы, бясплатная паркоўка, дазваляецца рыбная лоўля з лодак. Асабліва вялікім попытам карыстаецца такі адпачынак у мінчан.

Задавальненне можна атрымаць не толькі ад самога працэсу, але і ад прыроды. Мясціны тут выключныя. Можна пабачыць чорнага бусла, белую чаплю, бугая і іншых чырванакніжнікаў. Шмат тут водзіцца норак, выдраў, андатраў. Цэлы запаведнік, адным словам.

**Намеснік дырэктара рыбгаса Уладзімір ГЕРЦАЎ** кажа, што праграмай развіцця іх прадпрыемства на наступныя пяць гадоў прадугледжана павялічэнне аб'ёмаў вырошчвання рыбы.

— Для гэтага нам спатрэбіцца зрабіць яшчэ некалькі сажалак, — удакладняе ён і дадае: — А яшчэ мы прапрацоўваем варыянты будаўніцтва фарэлевага комплексу. Хочацца парадаваць нашых спажыўцоў яшчэ больш разнастайным таварам.

### Запрашаем на рыбалку

Для тых, хто збіраецца на рыбалку ў рыбгас «Свіслач» або гатовы рабіць бізнес на продажы смачнай чыстай рыбы, паведамляем: гаспадарка знаходзіцца па адрасе: Магілёўская вобласць, Асіповіцкі раён, вёска Вяззе, вуліца Паўднёвая, д. 28. Тэлефон 8 (02235) 43506. Улоў гарантаваны!

УНП 790083290

# «ТУТ КОЦЯЦЬ ХВАЛІ ПЦІЧ З БЕРАЗІНОЮ...»

**Асіповіцкі паэт і журналіст Анатоль Тамашэўскі прысвяціў роднаму краю шмат вершаваных радкоў. Гэтыя мясціны сапраўды настройваюць на лірычны лад. Яны багатыя на цікавыя гістарычныя месцы, унікальную і надзвычай разнастайную прыроду, шчырых і добразычлівых людзей. Летась Асіповічы ўрачыста адзначылі 145-ю гадавіну з дня свайго нараджэння. Датай заснавання горада лічыцца 17 лістапада 1872 года, калі тут пачала функцыянаваць адна з найбуйнейшых станцый Лібава-Роменскай чыгункі ў Расійскай Імперыі. Назву яна атрымала ад найбліжэйшага на той час пасёлка Асіповічы. Потым імя атрымаў у спадчыну горад.**

Сёння гэта буйны чыгуначны і прамысловы вузел, які імкліва развіваецца і прыгажэе. І шмат што для сваёй малой радзімы робяць тутэйшыя ўраджэнцы. Дастаткова ўспомніць алімпійскіх чэмпіёнаў братоў Аляксандра і Андрэя Баргдановічаў, былога камандуючага паветрана-дэсантнымі войскамі Расійскай Федэрацыі Георгія Шпака, мастака Уладзіміра Стальмашонка. Кожны год спіс ганаровых грамадзян Асіповіч павялічваецца. Сёлета ў яго трапілі вядомыя ўраджэнцы Асіповіцкага краю: колішні міністр эканомікі Уладзімір Зіноўскі і генеральны дырэктар спартыўнага комплексу «Мінск-Арэна» Мікалай Ананьеў.



У горадзе працуе шмат буйных прадпрыемстваў, якія добра ведаюць далёка за межамі краіны. Мацнеюць міжнародныя сувязі і завязваюцца новыя дзелавыя кантакты. Нядаўна горад наведала дэлегацыя з Кітайскай Народнай Рэспублікі і быў падпісаны мемарандум аб устанаўленні сяброўскага супрацоўніцтва паміж горадам Янчжоу правінцыі Цзянсу і Асіповіцкім раёнам.

**Матэрыялы выпуску падрыхтавала Нэлі ЗІГУЛЯ.**


**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 18 сентября 2018 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 80 % после третьих несостоявшихся торгов по продаже предприятия как имущественного комплекса, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Коминтерн» на праве собственности и находящегося на праве хозяйственного ведения у Производственно-торгового унитарного предприятия «Речицкая швейная фабрика»**

| № лота | Наименование объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %) | Задаток, руб. (в т. ч. НДС по ставке 20 %) |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Предприятие как имущественный комплекс, **регистрационный номер 0001401,** свидетельство о государственной регистрации **№ 3337** выдано Открытому акционерному обществу «Коминтерн» 09.02.2018 г. | Предприятие как имущественный комплекс создано на базе Производственно-торгового унитарного предприятия «Речицкая швейная фабрика» (Унитарное предприятие «Речицкая швейная фабрика»), местонахождение: Гомельская обл., Речицкий р-н, г. Речица, ул. Луначарского, 39.<br>Имущество и имущественные права, входящие в состав предприятия как имущественного комплекса, согласно перечню на 31.10.2017 г.:<br>– основные средства 58 единиц (в т. ч. 4 навеса, производственное здание с 11 изолированными помещениями, бензохранилище, 2 здания складских помещений, здание гаражей, здание мехмастерской, туалет надворный, водопроводная сеть, канализационная бытовая сеть, теплоснабжение наземное, прочие основные средства в количестве 33 единицы);<br>– денежные средства;<br>– долги (обязательства);<br>– права требования;<br>– товарно-материальные ценности.<br>Части зданий и изолированных помещений обременены договорами аренды, последний сроком по 02.10.2021 г., общая арендуемая площадь 1 218,23 кв. м. | **125 383,87** | **10 000,00** |

Для обслуживания зданий и сооружений, входящих в состав предприятия как имущественного комплекса, выделен земельный участок на праве постоянного пользования площадью 0,7067 га с кадастровым номером 324550100001000063. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

Шаг аукциона – 5 %. Место проведения аукциона: г. Гомель, ул. Артема, 23. Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2–6** по рабочим дням с 09.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 17 сентября 2018 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления, заключившие с Организатором торгов соглашение, получившие билеты участников аукциона и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **18 сентября 2018 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объект по начальной цене, увеличенной на 5 %.

**К заявлению на участие в аукционе прилагаются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора торгов, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия свидетельства о государственной регистрации этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, с предъявлением оригинала для заверения его копии организатором аукциона; юридическим лицом – копия учредительных документов с предъявлением оригинала для заверения его копии организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть датирована не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык; иностранным индивидуальным предпринимателем - легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь - доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или трудовой договор (контракт), или иные документы в соответствии с законодательством). В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с BY84ALFA30122305700080270000 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, BIC: ALFABY2X. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту № 1** согласно извещению в газете «Звязда» от 4 сентября 2018 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан**: в течение 3 рабочих дней после подписания протокола аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 1,5 % от окончательной цены продажи Объекта; в течение 20 календарных дней после подписания протокола аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объекта, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объекта, не достигнута договоренность по срокам и порядку оплаты Объекта, такая оплата должна быть произведена в течение 30 календарных дней с момента подписания протокола аукциона.

Извещения о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту были опубликованы в газете «Звязда» от 05.05.2018 г. № 85, от 17.07.2018 г. № 134, от 15.08.2018 г. № 155

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. Тел.: 8 (0232) 32-46-47; 32-18-95 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by**
**Продавец: ОАО «Коминтерн», г. Гомель, ул. Интернациональная, 5. Тел.: 8 (029) 172-20-88; 8 (044) 721-66-49.**



Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | Смолевичское районное потребительское общество, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д. 133 |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение:** Минская обл., Смолевичский р-н, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 5

| Наименование (назначение) | Общ. пл. | Инв. номер |
|---|---|---|
| **Здание кафе «Селянская хата»** (здание специализированное для общественного питания) | 99 кв. м | 614/С-42969 |

***Сведения о земельном участке:*** предоставлен на праве аренды (сроком до 13.09.2035) общ. пл. **0,0551** га для обслуживания здания кафе «Селянская хата» и склада. Ограничение (обременение): охранная зона линий электропередачи, пл. 0,0035 га

**Начальная цена с НДС 20 % – 27 770,88 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **09.10.2018** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **05.10.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |



**ООО «Торговый Дом «Немига-Фаворит»**

(УНП 500344877, юридический адрес: г. Минск, пер. Багратиона 2-й, д. 18А, каб. 6)

**информирует о том, что**

единственным участником общества с ограниченной ответственностью «Торговый Дом «Немига-Фаворит» принято решение (Решение № 8/18 от 03.09.2018) 12 сентября 2018 года произвести досрочное погашение второго выпуска именных, процентных облигаций в бездокументарной форме ООО «ТД «Немига-Фаворит» (идентификационный код выпуска ценных бумаг BY 50002B7969, выпуск зарегистрирован 4 августа 2018 года, государственный регистрационный номер выпуска ценных бумаг – 5-200-02-3066) (далее – Облигации). Досрочное погашение Облигаций будет производиться в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь, в порядке и на условиях, установленных Проспектом эмиссии облигаций второго выпуска ООО «ТД «Немига-Фаворит» по текущей стоимости Облигации, рассчитанной на дату досрочного погашения. Реестр владельцев Облигаций будет сформирован по состоянию на 10 сентября 2018 года

## Кацярына СНЫЦІНА:

# «Пасля венгерскай чорнай пустэчы з'явілася турэцкае сонца»

### ПРА БАСКЕТБОЛ, ТАТУІРОЎКІ, САБАК І СІРЫЮ

**Яе прыход у спорт быў заканамерным: бацькі Каці пазнаёміліся на баскетбольнай пляцоўцы. Сн准іна была часткай нашай нацыянальнай каманды ў найлепшыя яе часы, калі Беларусь падымалася на п'едэстал чэмпіянату Еўропы і ўдзельнічала ў Алімпійскіх гульнях. У камандзе Кацярына і цяпер, калі ўсімі любімая дрым-цім ужо зусім іншая. У нядзелю капітан беларускай зборнай адсвяткавала свой 33-ы дзень нараджэння, гэта і стала падставай сустрэцца з вядомай баскетбалісткай і напярэдадні старту новага сезона пагаварыць пра пражытыя ў спорце гады, абмеркаваць татуіроўкі і даведацца пра яе неверагодную любоў да сабак.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

* * *

***— Каця, адпачынак заканчваецца. Як вы яго правялі?***

— Шыкоўна! Я вельмі даўно так доўга не была дома ў Мінску з бацькамі і сям'ёй. Мне здаецца, прайшоў тыдзень з таго моманту, як скончыўся сезон, але літаральна праз тыдзень у мяне ўжо пачнецца новы. Адпачынак атрымаўся вялікі — практычна тры месяцы, але лета праляцела вельмі хутка. За гэты час я выканала праграму максімум, правяла час з сям'ёй, з'ездзіла на мора, зрабіла сабе невялікую экскурсію ў Рым, разам з тым трэніравалася і ўдзельнічала ў розных мерапрыемствах ад Федэрацыі баскетбола.

***— Мяркуючы па вашых сацсетках, хапала і экстрыму... Вы паспрабавалі сплаў на байдарках.***

— Так, там было столькі камароў, што для мяне гэта аказалася сапраўды экстрэмальна. Я ўжо некалькі гадоў прасіла сваю стрыечную сястру ўзяць мяне з сабой, яны ходзяць у такія паходы на тыдні, але я хацела нешта лёгенькае, на дні два. І вось нарэшце адбылося. Наогул, не магу сказаць, што заўсёды люблю актыўна адпачываць, былі дні, калі я адчувала сябе стомленай ці проста не было настрою, тады валялася дома з сабакамі.

***— Не забывалі вы і пра трэніроўкі.***

— Так, працавала пад кіраўніцтвам майго трэнера Таццяны Лавец апошнія два месяцы. Калі была ў Мінску, заняткі праходзілі шэсць разоў на тыдзень па дзве, дзве з паловай гадзіны. Не варта прыбіраць трэніроўкі ў адпачынку з жыцця любога спартсмена, калі напярэдадні ў цябе яшчэ сезон, гэта закладвае фізічную базу, якая абавязкова спатрэбіцца.

З-за таго, што ў мяне не было гульняў са зборнай, гэтым летам я паглядзела, мабыць, усе матчы маладзёжных камандаў, раней на гэта не было часу, ды і жадання, калі шчыра. Але чэмпіянат свету да 17 гадоў праводзіўся ў Мінску ўпершыню за 32 гады, не хадзіць туды было б неяк няправільна. Мне было цікава паглядзець і на нашых дзяўчат, і на іншыя еўрапейскія і амерыканскія каманды, гэта зоркі, якія праз чатырыпяць гадоў будуць гуляць у дарослых лігах.

***— Самі па баскетболе засумавалі?***

— Так, ужо хутчэй хачу аказацца ў камандзе, усё ж такі гэта мая любімая гульня, гэта тое, што мне падабаецца.

* * *

***— Мінулы сезон вы правялі ў турэцкім «Хатаі», пасля чаго працягнулі пагадненне яшчэ на год, гэта значыць, вас усё задавальняе ў Турцыі?***

— Так, чэмпіянат класны, адзін з наймацнейшых у Еўропе. Краіна мне падабаецца, з клубам мы разумеем, што хочам адно ад аднаго, у пэўным плане давяраем адно аднаму. У нас добрае супрацоўніцтва.

***— Што датычыцца самой краіны, жыць там вам камфортна?***

— Цалкам. Самае нязвыклае было тое, што туркі настолькі таварыскія і добразычлівыя. Стэрэатыпы аб гэтай нацыі, як аказалася, зусім іншыя. Маўляў, усе жанчыны там ходзяць у хіджабах, а мужчыны-мусульмане проста тыраны. На самай справе гэта не так. Вядома, ёсць нюансы. На другі дзень знаёмства яны могуць казаць, што ты іх сястра, як усё выдатна і што мы заўсёды будзем разам, а праз тры дні ўся гэтая любоў заканчваецца. Я прайшла праз гэта яшчэ ў першы свой прыезд у Турцыю, калі мяне звольнілі з клуба, таму адэкватна стаўлюся да такіх іх адносін.

> **«Гісторый пра боль і траўмы ў маёй кар'еры дакладна хапіла б на кнігу».**

***— Горад, у якім гуляеце, знаходзіцца за 30 хвілін язды ад Сірыі, напэўна, вы ведалі пра гэта, падпісваючы кантракт.***

— Так, але тады я хвалявалася больш не пра Сірыю, у Анкары на той момант якраз адбываўся дзяржаўны пераварот, калі туды ўводзілі войскі. Праз тыдзень я павінна была ляцець у Турцыю. Патэлефанаваў трэнер: «Каця, у нас тут праязджаюць танкі, але ты прылятай, у Хатаі ўсё спакойна». Было, вядома, не вельмі камфортна, ты ж не ведаеш, можа, заўтра пачнецца вайна.

Апошні год быў адносна спакойны для нас, адзінае, у Сірыі ўзарвалі нейкі хімзавод, але каманды тады не было ў горадзе. Мы прыехалі толькі праз тыдзень, людзі казалі, што пасля здарэння пяршыла ў горле, было цяжка дыхаць, ну, вядома, калі мне гэта расказалі, то і ў мяне ў горле стала пяршыць. *(Усміхаецца.)*

* * *

***— Вы пагулялі ў розных краінах і чэмпіянатах. Які перыяд сваёй кар'еры назавяце самым паспяховым і, наадварот, няўдалым?***

— Выдатны час у мяне цяпер у «Хатаі», дзе я добра праяўляю сябе як гулец, і пры гэтым яшчэ каманда атрымлівае медалі, выходзіць у Еўралігу. Гэта вельмі прэстыжна, асабліва ў Турцыі. Самы стрэсавы перыяд быў, калі я гуляла ў Венгрыі тры месяцы, мы жудасна выступалі, я не магла гуляць, ну, вось наогул нічога не атрымлівалася. Я ведаю, што ўмею гуляць, што раней нармальна гуляла, але нічога не магла зрабіць у той момант. Мяне звольнілі. Пасля венгерскай чорнай пустэчы ў мяне з'явілася турэцкае сонца.

***— Вашы бацькі таксама звязаныя са спортам. Яны часта ўплывалі на вашу кар'еру?***

— Я, як нармальная дзяўчына, маладая іх ніколі не слухала, гэта цяпер я магу патэлефанаваць маме, тату, дома сесці і абмеркаваць, ці варта падпісваць кантракт, што яны думаюць пра змену клуба і гэтак далей. Бацькі ніколі не навязвалі мне свайго меркавання, але я ведала, што заўсёды магу папрасіць парады. Проста не рабіла гэтага, бо думала, што разумнейшая за ўсіх. Бацькі глядзяць усе мае гульні па інтэрнэце, калі ў Мінску, то яўка абавязковая. Яны ведаюць, як я гуляю, як умею гуляць і як не ўмею.

***— Ці могуць пасварыцца пасля гульні?***

— Вядома. Тэлефаную дадому — усё роўна, выйграла або прайграла — і чую пытанні: «Чаму ты гэта не зрабіла, а чаму гэта?» Тата заўсёды з крытычнага боку падыходзіць, ведае, дзе палепшыць маю гульню. Часам у мяне вока торгаецца, таму што я не хачу гэта слухаць. Але з узростам становішся мудрэйшым, зараз я іх слухаю і чую.

* * *

***— Вашы балельшчыкі ведаюць пра любоў да татуіровак і сабак. Адкуль гэта?***

— Любоў да сабак паўстала са з'яўленнем маёй сабакі 10 гадоў таму, а вось да татуіровак была з юнацтва. Першая тату з'явілася ў гадоў 19, гэта кацііня лапкі на плячах. Цяпер у мяне ўжо сем татуіровак, самая любімая апошняя, на якой намаляваны мой сабака Дызель.

***— Кажуць, што пасля адной татуіроўкі спыніцца ўжо складана...***

— Калі яе набіваюць, табе балюча, але выходзіш, і хочацца прыйсці на наступны дзень і зрабіць яшчэ. Калі гэты момант пераджыць, то, можа, ужо і не зробіш. Але я думаю, наўрад ці ёсць чалавек, які спыніўся на адной татуіроўцы. Пасля апошняй мне было так балюча, што, калі я адтуль выйшла, пайшоў, напэўна, адваротны працэс, я сказала, што ніколі больш не зраблю тату.

***— Вы завялі сабаку нягледзячы на пераезды і нават нейкі час вазілі яго з сабой па краінах.***

— Я люблю сабак, але цяпер усім кажу: не заводзьце жывёл, пакуль не скончыце з баскетболам. Два гады Дызель быў са мной у Польшчы, падчас ад'ездаў яго даглядала адна сям'я з балельшчыкаў нашага клуба. З імі я пакідала сабаку са спакойнай душой, можа быць, хтосьці будзе смяяцца, але гэта як дзіця: аддаць яго камусьці хоць на некалькі дзён вельмі складана. Потым я спрабавала перавезці Дызеля з сабой у Расію, але нічога з гэтага не выйшла, таму што там у мяне быў вельмі цяжкі графік. Бацькі сказалі: «Не мучай ні сябе, ні сабаку, ён выдатна з намі жыве». І забралі Дызеля.

***— Вы набіваеце татуіроўкі з яго выявай, значыць, Дызель стаў для вас ужо нечым большым, чым сабака?***

— Зараз ён жыве з намі ўжо 10 гадоў, гэта частка нашай сям'і, мы ўжо даўно яго так успрымаем. Нават размаўляю з ім, а ён мне адказвае.

* * *

***— Ведаю, што вы праходзіце дыстанцыйнае навучанне праз інтэрнэт і любіце чытаць.***

— Чытаю толькі тое, што мне падабаецца, калі не спадабаліся першых пяць старонак кнігі, значыць, не маё. У мінулым сезоне нават ставіла перад сабой такую задачу: чытаць адну кнігу на тыдзень, з усімі гэтымі нашымі пераездамі яны выдатна заходзяць. Вучылася чытаць хутка, дайшла да такога, што чытала вельмі хутка, але зразумела, што нічога не запамінаю. Апошнія пару гадоў кожная другая кніга — гэта аўтабіяграфія або расказ пра жыццё якога-небудзь спартсмена ці фірму або бізнес. Мне проста цікава, як у людзей усё гэта атрымліваецца.

***— Ёсць кніга, якая аказала на вас асаблівы ўплыў?***

— Самая першая, якую я прачытала яшчэ ў дзяцінстве, — «Як перастаць турбавацца і пачаць жыць» Дэйла Карнегі. У ёй можна знайсці вельмі шмат фраз, якія цяпер лёгка ўбачыць на любым матывацыйным сайце. Груба кажучы, калі я пакутавала з-за таго, што ў мяне не было новых красовак, бацькі не маглі гэтага дазволіць, адной фразай з гэтай кнігі я магла ўсё растлумачыць для сябе («Я турбаваўся, што ў мяне не было новых чаравікаў, пакуль не ўбачыў чалавека, у якога не было ног»). Яшчэ мне падабаецца біяграфія Марыі Шарапавай, якую яна напісала нядаўна. Як чалавек з чатырох гадоў ішоў да таго, каб дасягнуць тытулаў, якія мае сёння, як яна прайшла праз допінгавы скандал і засталася на шляху да сваёй мэты.

***— Вы самі ніколі не думалі над тым, каб напісаць аўтабіяграфічную кнігу?***

— Мне гэтая ідэя неяк прыходзіла ў галаву: гісторый пра боль і траўмы ў маёй кар'еры дакладна хапіла б на кнігу. Але потым я падумала, што, можа, гэта нікому не трэба.

* * *

***— Трохі пра баскетбол. Наша жаночая зборная зараз знаходзіцца ў няпростай сітуацыі, як змянілася атмасфера ў калектыве і колькі трэба часу, каб выйсці на ранейшы ўзровень?***




— Атмасфера ў зборнай стала як у клубе. Раней я прыязджала і гэта была мая сям'я, мы ўсе раслі, доўга гулялі, трэніраваліся і жылі разам. Зараз я прыязджаю і гэта толькі праца: прыехала, адпрацавала і паехала далей у клуб. Хутчэй за ўсё, так атрымліваецца, таму што ў зборнай шмат новых людзей. Наколькі магчыма ўсім нам яшчэ штосьці выйграць? Я лічу, што магчыма, вось зараз, у 2018 годзе, калі ва ўсіх нас будзе добры дзень у плане гульні. На мінулым чэмпіянаце Еўропы такіх дзён не было. Ні ў адной гульні не было лёгкасці, удачы, таму там мы прайгралі, гэта заканамерна. Складана сказаць, як зборная адыграе ў лістападзе ці ў лютым. Мы ніколі не выступалі стабільна пры любым складзе, таму трэба пацярпець, трэба сыгрывацца. Магчыма, гэта будзе доўгі працэс, але без чорнай паласы мы на белую не выйдзем.

***— У нядзелю вы адсвяткавалі дзень нараджэння. Што за гэтыя гады ўдалося зрабіць і што ў вашых планах?***

— Колькі мне? Трыццацьтры? Я шчаслівая, займаюся любімай справай, мая сям'я побач. Выдатны варыянт. Што будзе далей? Я спадзяюся, што буду займацца любімай справай, мая сям'я будзе побач і я буду шчаслівая.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# ШЛЯХ

**Пра тое, як распачалася наша роварная вандроўка па маршруце «Валожынскія гасцінцы», я пісала 21 жніўня. Пра тое, дзе знайсці патрэбную інфармацыю і як дабрацца да пачатку маршруту. Пра наведванне колішняй сядзібы вялікага беларускага мастака Фердынанда Рушчыца. Пра ўнікальныя і вельмі прыгожыя могілкі часоў Першай сусветнай вайны ў вёсцы Дзесятнікі. Пра ацалелы дом паляўнічага і маляўнічы парк у сядзібе Храптовічаў «Адравонж». Аднак далей нам сустрэліся не менш прыгожыя краявіды і добрыя людзі.**

## Месца сілы Вішнева

Вішнева — месца, безумоўна, унікальнае. Сюды варта зазірнуць (нават калі вы без ровара). Нам жа пашчасціла там апынуцца спякотным летнім днём, пасля доўгага пераезду. І адразу папіць надзвычай смачнай вады і аднавіць сілы каля крыніцы, якая цячэ адразу за касцёлам Дабравешчання Найсвяцейшай Панны Марыі: лічыцца, што вада тут гаючая.

Мы затрымаліся каля крыніцы надоўга, зноў і зноў зачэрпваючы чыстую і прахалодную ваду. Зрэшты, і абмеркаваць было што. Згадвалі Сымона Будната, які жыў усяго за сем кіламетраў ад Вішнева ў Лоску і быў у свой час выдатным дзеячам Рэфармацыі, выдаў першую кнігу на тэрыторыі сучаснай Беларусі. А жыццё сваё скончыў даволі сумна, быў адлучаны ад царквы, пазбаўлены сану і свой зямны шлях, поўны нягод і матэрыяльных цяжкасцяў, завяршыў таксама ў Вішневе.

Але варта пачаць усё-такі з галоўных сённяшніх славутасцяў Вішнева. Сярод іх касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Панны Марыі. На фасадзе можна пабачыць дату 1424 — гэта год яго заснавання вялікім князем Вітаўтам (па іншых звестках, кашталянам віленскім Сямёнам Гедыгольдавічам).

*«За час свайго існавання касцёлу ўсё ж давялося зведаць некаторыя змены, прычым неадночы. Спачатку ён быў перабудаваны ў стылі барока, але пасля моцнага пажару 1771 года аднаўляўся на сродкі сям'і Храптовічаў: акрамя замены інтэр'ера (з'явіліся нехарактэрныя для барока, амаль гатычныя ўзорыстыя скляпенні, шмат фрэскавага жывапісу, алтары XVIII стагоддзя з драўлянымі скульптурамі), былі прыбудаваны дзве квадратныя капліцы каля алтарнай часткі. Але найбольш прыкметныя знешнія змены адбыліся тут ужо ў пачатку XX стагоддзя, калі быў зменены фасад будынка: у 1906 годзе над уваходам выраслі дзве звыклыя для традыцыйнага барока вежы».*



Дом Шымона Перэса.

Побач з касцёлам знаходзіцца прыгожая званіца, якая ў той жа час з'яўляецца варотамі. Яна была пабудавана ў другой палове XIX стагоддзя. Па лесвіцы можна падняцца, дакрануцца да званоў, паглядзець з вышыні на наваколле.

Менавіта ў гэтым касцёле ў свой час служыў легендарны ксёндз Уладзіслаў Чарняўскі. У савецкі час Вішнева было адзіным месцам ва ўсёй краіне, дзе службы працягвалі весціся па-беларуску! Ці ж не сапраўдны гэта подзвіг мужнасці і стойкасці? Пахаваны ксёндз тут жа, у касцельным дворыку.

На старых могілках у Вішневе знайшла апошні спачын вядомая паэтка Канстанцыя Буйло. А побач з ёй Пятро Бітэль — яго пераклад паэмы Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш» на беларускую мову, зроблены падчас зняволення ў ГУЛАГу на мяхах з-пад цэменту, прызнаны самым блізкім да арыгінала.

Праехаўшы касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі, непадалёк можна ўбачыць царкву Святых Казьмы і Дзям'яна.

*«Царква была пабудавана ў 1865 годзе ў рэтраспектыўна-рускім стылі, які атрымаў асабліва значнае распаўсюджанне ў Беларусі пасля падаўлення нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863 года. У разгроме паўстання сумна праславіўся віленскі генерал-губернатар Мураўёў, апантаны русіфікатар, які атрымаў у народзе мянушку «вешальнік». Цэрквы, якія следам за тым сталі паўсюдна будавацца па тыпавых праектах, дасланых са сталіцы Расійскай Імперыі, у народзе ахрысцілі «мураўёўкамі».*

Праехаўшы царкву, праз колькі дамоў можна пабачыць дом дзявятага прэзідэнта Ізраіля Шымона Перэса, лаўрэата Нобелеўскай прэміі міру. У свой час Шымон эміграваў адсюль у Палесціну. Яго родныя, якія засталіся ў Вішневе, у 1941 годзе загінулі ў агні халакосту.


На магіле ксяндза Уладзіслава Чарняўскага.

## Мосцік праз багну

У папярэднім артыкуле пра «Валожынскія гасцінцы» я згадвала нашага анёла Сяргея. Адзначу, што ён працягваў з'яўляцца побач вельмі дарэчы: калі трэба было зразумець, куды павярнуць, калі мы рамантавалі педаль аднаго ровара. І вось менавіта Сяргей расказаў нам пра драўляныя мосцікі ў балоце. Я не асабліва загарэлася, але пагадзілася са сваімі кампаньёнамі, якія вельмі захацелі іх убачыць. Ад Вішнева мы праехалі 15 кіламетраў у бок Сакаўшчыны па прамой асфальтаванай дарозе. А далей пільна ўглядаліся ў правы бок, пакуль не заўважылі добрую грунтавую дарогу, якая вяла ў лес.

Праехаўшы крыху, мы пабачылі паварот на пясчаны кар'ер. Не ва ўсіх вандроўнікаў ужо былі сілы збочыць, каб дабрацца да яго. Аднак такія месцы па-свойму вельмі адметныя: тыя, у каго хапіла сіл да яго дабрацца, пабачылі гіганцкія глыбы пяску. Такая невялікая мясцовая пустыня, цалкам акрэсленая, але ўсё-такі напоеная настроем Поўдня.

З задавальненнем пафатаграфаваліся там, пасярод пяскоў, пад сонцам, якое пякло ўжо даволі моцна. Я зрабіла яшчэ колькі здымкаў і на фоне яркага бірузова-ізумруднага будаўнічага вагончыка (побач здабываюць пясок і нарыхтоўваюць лес). Такія моманты, вырваныя са звыклай праграмы, з іншай надзвычайнай вастрынёй адчуванняў, вельмі западаюць у памяць — ці хутчэй у падсвядомасць, якая адказвае за эмацыянальныя перажыванні.

Вярнуўшыся на лясную дарогу, мы зноў ехалі скрозь балоты ў чаканні тых самых мосцікаў. Наваколле паціху мянялася. Калі спыніліся, каб адпачыць, пабачылі, што ўся дарога спрэс у мурашніках з вялікімі чырвонымі мурашамі, таму паспяшаліся паехаць далей. Месцамі навісалі нахіленыя танклявыя бярозы. Нарэшце прыехалі ў пятлю: дарога рабіла паўкола, злучалася сама з сабой і на гэтым заканчвалася. Насякомых было яшчэ болей, з усіх бакоў нас атачалі авадні. Я пакінула ровар і паспрабавала прайсці ўглыб — можа, пабачу мосцікі?.. Аднак робячы крок за крокам, разумела, што папросту ўсё болей паглыбляюся ў багну. Было відавочна, што далей лепей не ісці, — ёсць рызыка правaліцца. Яшчэ двое з нас прайшлі наперад, туды, дзе канчалася пятля, аднак таксама нічога падобна-

---

Пантэон Айчыны

# Францыск Скарына *(? — каля 1552)*

Францыск Скарына — гонар беларускай нацыі. Ён сапраўдны феномен — гістарычны, культурны і проста чалавечы. Чалавек, пра жыццё якога мы ведаем даволі мала, але пра яго напісана вельмі шмат. Ён хіба не самы вядомы беларус у свеце. Юнак з купецкай сям'і «из славного града Полоцька» (як ён пазней адзначаў у сваіх кнігах) здолеў паступіць у Кракаўскі ўніверсітэт і спасцігнуць таямніцы тагачаснай навукі, стаць сакратаром караля Дацыі (Даніі), уразіць сваімі пазнаннямі ўмудроных прафесараў славутага Падуанскага ўніверсітэта. У грамаце ад 9 лістапада 1512 года адзначалася: «Ён праявіў сябе настолькі слаўна і дастойна ў час гэтага свайго строгага экзамену, калі выкладаў адказы на зададзеныя яму пытанні і калі абвяргаў прапанаваныя яму доказы, што атрымаў аднадушнае ўхваленне ўсіх вучоных без выключэння і было прызнана, што ён мае дастатковыя веды ў галіне медыцыны». Грамату падпісалі 24 магістры. І ў далейшым пра Францыска Скарыну як пра выдатнага чалавека і культурнага дзеяча з пахвалой казалі надзеленыя высокай уладай асобы. Вось прускі герцаг Альбрэхт паведамляе 16 мая 1530 года віленскаму ваяводзе Альбрэхту Гаштольду аб прыездзе ў Кёнігсберг Францыска Скарыны, называючы яго «даравітым выкладчыкам», адзначаючы як яго «дзівосны талент, так і найвышэйшае майстэрства, якое ён дэманструе са здзіўляючым бляскам і вопытнасцю». У 1532 годзе Скарыну ўзяў пад сваю асабістую апеку кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Казіміравіч, «лічачы вартай даверу дабрачыннасць, незвычайную вучонасць у мастацтве, медыцыне, дасведчанасць і ўменне». Зразумела, што такога высокага прызнання не мог заслужыць звычайны пасрэдны чалавек, нават магнат.

Сапраўдны гістарычнай з'явай стала выданне Скарынам у 1517 годзе ў Празе першых друкаваных беларускіх кніг (і ўвогуле ўсходнееўрапейскіх). Далёка ад радзімы, без трывалай падтрымкі, без аднадумцаў, амаль у адзіночку ён пачаў вялікую справу. Ягоная асветніцкая дзейнасць яскравым метэорам расквяціла небасхіл тагачаснай беларускай культуры.

Пра Скарыну можна казаць як пра асветніка, які сваімі кнігамі даў «детем малым початок всякое доброе науки, дорослым помножение в науце»; вучонага-лінгвіста, які першы пераклаў Свяшчэннае Пісанне з царкоўнаславянскай мовы на размоўную мову народа — сваю родную, «наболей с тое причины, иже мя милостивый Бог с того языка на свет пустил», як пра друкара-наватара, які выкарыстаў у кнігадрукаванні шэраг новаўвядзенняў — тытульны ліст і кампактны фармат кнігі; як пра мастака-дызайнера, які ўпрыгожыў сваe кнігі высокамастацкімі гравюрамі, застаўкамі, прыгожымі віньеткамі і ініцыяламі; як пра мысляра, які сцвярджаў гуманістычныя ідэі і праслаўляў творчую дзейнасць чалавека; як пра патрыёта, які ганарыўся сваім слаўным Полацкам; як пра медыка, які быў асабістым лекарам віленскага біскупа Яна; як пра батаніка, які даглядаў каралеўскі сад у Празе; як пра гандляра і нават авантурыста. І ён па-ранейшаму застаецца для нас загадкай. Ад Скарыны, як ад напасці, у 1525 годзе ўцякае з Вітэнберга сам бацька Рэфармацыі Марцін Лютэр. Нібыта доктар Францыск прыехаў у Вітэнберг зжыць Лютэра. Загадкавы эпізод з біяграфіі Скарыны. Загадкавы іншы выпадак, калі Скарына ў 1530-м з'ехаў з Кёнігсберга, звёўшы з сабой лекара і друкара, што выклікала прыкрасць у прускага герцага. Таямнічая паездка Скарыны ў Маскву, дзе публічна спалілі яго кнігі. Не ясны падаецца і гісторыя арышту Скарыны ў 1532 годзе за пазыкі ягонага брата Івана Скарыны. Як высветлілася, Францыск да братавых пазык не меў дачынення. Але відавочна выконваў таемныя даручэнні віленскага біскупа Яна — пазашлюбнага сына караля Жыгімонта Казіміравіча. Ці не таму кароль выдаў Скарыну прывілей на асаблівую каралеўскую ласку, вызваліў яго ад усіх павіннасцяў і гарадскіх службаў, забараніў усім саноўным умешвацца ў ягоныя справы, які ні былі б яны важныя ці нязначныя. Якія мог справы шэрага кардынала ўрада Вялікага Княства Літоўскага выконваць Скарына? Як бачым, шмат чаго з жыцця Францыска Скарыны застаецца па-за ўвагай гісторыі, ахутана завесай таямніцы.

Феномен Скарыны праявіўся ва ўсім яго жыцці і дзейнасці. Ягоная цяга да ведаў — гэта праява духоўных патрэбнасцяў тагачаснага беларускага грамадства. Ягонае асветніцтва — гэта ўжо духоўная патрэба самога Скарыны быць карысным «людям простым, посполитым». Ягоныя кнігі сталі ўзорам для кнігадрукароў. Ягоныя думкі — узорамі філасофскага разумення чалавечага жыцця і прызначэння. Ягоная культурная дзейнасць далучыла беларускую культуру да еўрапейскай. Ягоныя гравюры — гэта своеасаблівыя мастацкія навелы аб тагачасным жыцці. Багатыя

# ДА ГАРЛАЧЫКАЎ

га на тое, што мы чакалі пабачыць, не знайшлі.

Балазе наш анёл Сяргей у адну са шматлікіх сустрэч ужо паспеў пакінуць свой нумар тэлефона. Мы пазванілі яму, каб высветліць, куды трапілі. Аднак тое, што пачулі ў адказ, было вельмі нечаканым:

— Што вы робіце там? Гэта ж гіблае месца! Хутчэй едзьце прэч!

— А мосцік? — ціха папрасіла спытаць я. Хутчэй не з цікаўнасці, а з жадання атрымаць нейкую яснасць.

У адказ на гэта пытанне мы пачулі:

— Лепш не суйцеся ні на якія мосцікі. Я калі быў там, дык па пояс праваліўся, а ровар выносіў на сабе на руках.


Сакаўшчынскае вадасховішча.

Што ж, калі з цікавінкамі не склалася, трэба было рушыць далей і сапраўды выбірацца адтуль.

## Вячэра ў сонцы

Вярнуўшыся нарэшце на асноўную дарогу (па дарозе падсілкаваўшыся чарніцамі), мы павярнулі направа — на асфальтаваную трасу, па якой ехалі ад пачатку. Да Сакаўшчыны, дзе знаходзілася наша меркаванае месца начлегу, трэба было пераадолець яшчэ кіламетраў восем. Дарэчы, вёска аказалася даволі доўгай — давялося праехаць яе наскрозь, кіруючыся да Сакаўшчынскага вадасховішча. Па яго ўзбярэжжы мы паехалі ўлева, пакуль не трапілі нарэшце ў домік для раварыстаў, які збудавалі гаспадары сядзібы «За масточкам» Дзмітрый і Ірына Наканечныя.

На вялікім роўным газоне каля доміка мы літаральна ўпалі без сіл. І хвілін дваццаць проста сядзелі ці ляжалі на траве нерухома. Аднак далей пачаў адбывацца чарговы цуд нашай вандроўкі. Па дамоўленасці гаспадары прыгатавалі для нас абед, аднак ужо была палова на сёмую вечара, таму ён ператварыўся ў вячэру...

Яркае летняе сонца зрабілася лагодным і паціху хілілася да небакраю, пасылаючы шчодрыя промні. Мы вячэралі на адкрытай тэрасе, яна была вельмі прыгожа асветлена. Ежу падалі ў зграбным парцалянавым посудзе — з зялёнымі ўзорамі, пад колер травы. Калі гарохавы суп можна лічыць фірмовай стравай, то гэта быў акурат той выпадак. Слоў не хопіць, каб перадаць, наколькі ён аказаўся смачны. Бутэрброды з кабачкамі і жоўтымі памідорамі, салата са свежай гародніны — не буду пералічваць усяго — а раптам вы яшчэ не елі?..

Далей было купанне пад зорамі і месяцам у Сакаўшчынскім вадасховішчы. Начныя размовы каля вогнішча. Раніцай — заплыў сярод гарлачыкаў па Ісլачы.

Маршрут «Валожынскія гасцінцы» разлічаны на тры дні. Мы ж вырашылі ўкласціся ў два выхадныя, таму істотна скарацілі яго і на другі дзень да мясцовых славутасцяў не заязджалі.

Склалася так, што размораныя сонейкам, прыемнай вадой, смачнай ежай, мы выехалі ў зваротны шлях да электрычкі на гадзіну пазней, чым планавалі. Таму давялося імчацца з велізарнай хуткасцю. Быў выбар: асфальтаваная дарога, але на восем кіламетраў даўжэйшая, ці вясковая, але карацейшая. Выбралі другі варыянт. На электроннай карце праставілі пункты, праз якія трэба праехаць, і такім чынам рушылі наперад.

Напачатку ў кукурузным полі трапілі ў тупік, давялося вяртацца. У астатнім усё было гладка. У пэўны момант мы з двума знаёмымі прыадсталі. Патэлефанавала наша сяброўка, якая была наперадзе, і сказала: «У лесе каля канапы паварочвайце направа ў кукурузу». Найперш падалося, што гэта проста набор слоў. Аднак пазней высветлілася: усё так і ёсць. На ўскрайку лесу стаіць канапа (арыгінальны арыенцір). А насупраць яе праз кукурузу сапраўды ідзе дарога. Далей мы зноў ехалі лесам, полем, яшчэ раз лесам. Праязджалі доўгую лясную вёсачку Куцяняты. Ад геастанцыі трапілі на мост, праехалі яго, звярнулі налева і па асфальтаванай дарозе яшчэ колькі часу ехалі проста, нікуды не зварочваючы.

Нарэшце дабраліся ў патрэбную нам вёску Гародзькі. Аказалася, што чыгуначная станцыя, якая называецца Валожын, зноў жа знаходзіцца на яе супрацьлеглым краі.

Усяго мы ехалі гадзіну сорак пяць хвілін на вялізнай хуткасці, амаль не спыняючыся. Але. Дызель памахаў нам хвастом і знік у кірунку Мінска. Давялося высвятляць на станцыі, ці можам мы правезці ровары ў пасажырскім цягніку? Нарэшце атрымалі станоўчы адказ. Набылі па два білеты — на сябе і на «жалезнага каня». Дарэчы, каб правесці ровар бясплатна, трэба адкруціць адно кола (калі ён габарытны), каб даўжынёй быў не болей за 1,2 метра, і закруціць цэлафанавай плёнкай — можна папросту надзець чахол для ровара, калі ён маецца. У нас жа не было ні таго, ні другога.

Дзве гадзіны ў Гародзьках прайшлі даволі прыемна: мы нарэшце расслабіліся і нікуды не спяшаліся.

У патрэбны час, калі прыйшоў прамы цягнік да Мінска, загрузілі ровары ў вагон і самі зайшлі следам. А ў тым самым вагоне сядзеў... Хто б вы думалі? Наш анёл Сяргей. З вялізным рулонам цэлафанавай плёнкі.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*Валожынскі раён*

■ Сваімі словамі

# ЧЭШЫРСКІЯ КАЗКІ



**Як сказаў хтосьці са знакамітых: «Не месца ўпрыгожвае чалавека, а чалавек месца». Часам цалкам звыклыя кварталы, дамы, пад'езды дзівосным чынам пераўвасабляюцца пад уздзеяннем рук чалавека, яго творчага погляду і ідэй. І хочацца прыгадваць такія прыклады.**

Пачнём з самага проста — з пад'ездаў. Вельмі рэдка, але часам удаецца трапіць у такія, дзе проста дух захоплівае ад таго, якую прыгажосць можна ўбачыць навокал. Гэта як невялічкі хатні філіял музея. Ну, хіба што мастацтва тут можа быць прымітыўным — але ад таго яно не перастае быць мастацтвам. Адметныя вобразы, яркія колеравыя спалучэнні, часам нават дзіўныя фігуры. Шэра ў такім пад'ездзе дакладна не будзе. Нагледзеўшыся на буянства фарбаў, напэўна ж захочацца і ва ўласнай кватэры дадаць яскравых дэталяў, зрабіць у звыклым інтэр'еры новыя смелыя вырашэнні. Асяроддзе ўплывае на нас. Усведамляем мы гэта ці не.

Прыгажосць пачала з'яўляцца і звонку нашых шматкватэрных дамоў, на фасадах. Зрэдку можна пабачыць прыгожыя мазаікі, зробленыя некалькі дзесяцігоддзяў таму. І гэта — самыя сапраўдныя творы мастацтва, пакуль што ашчадна захаваныя часам.


Дзіцячая пляцоўка каля Пейзажнай вуліцы ў Кіеве.

У апошнія гады на гарадскіх дамах пачалі актыўна з'яўляцца муралы — вялікія выявы на сценах. Іх можна пабачыць у самых розных гарадах — і нават гэтым яны адметныя. У кожным населеным пункце прасочваюцца свае тэмы, агульныя вобразы. Нават не жывучы ў горадзе, а пабываўшы ў ім адзін раз, пабачыўшы такія адмысловыя графіці на сценах, пачынаеш лепш адчуваць атмасферу, уяўляць, чым тут жывуць, што першаснае і што важнае для гараджан.

Ужо колькі гадоў у беларускай сталіцы на сценах з'яўляюцца ўнікальныя муралы, вялізныя малюнкі памерам на ўсю сцяну шматпавярховіка. Іх ствараюць пераважна дзякуючы арт-праекту Urban Myths. Яго аўтары запрашаюць замежных мастакоў, якія малююць работы ў залежнасці ад атрыманых уражанняў аб краіне: ніякіх эскізаў і падрыхтоўкі. У выніку ў іх атрымліваюцца сапраўды арыгінальныя выявы: з аднаго боку, яскрава прасочваюцца нашы нацыянальныя матывы, а з другога, яны пададзены ў цікавай сучаснай форме.

Неяк спрачаўся са мной адзін знаёмы і казаў, што мурал — гэта не мастацтва. Маўляў, часовая такая выява, не вечная, не пастаянная — куды ёй быць мастацтвам? Аднак па мне ўсё, што робіць жыццё людзей лепшым, — і ёсць мастацтва. І штосьці больш сучаснае і актуальнае ў мастацкай сферы цяпер складана знайсці.

Адметна, што муралы зазвычай ствараюць у спальных раёнах — мастацкіх музеяў і галерэі паблізу няма. Таму такія ўзоры творчасці, хай сабе і вулічнай, значна ўзбагачаюць тых, хто бачыць яе кожны дзень.

Не так даўно была ў Кіеве, наведала трохгадзінную экскурсію па ўкраінскай сталіцы. І найбольш уразіла мяне... дзіцячая пляцоўка! Знаходзіцца яна побач з Пейзажнай вуліцай. Праўда, гэта не самая звычайная пляцоўка. Малады ўкраінскі скульптар Кастусь Скрытуцкі перад тым як стварыць яе, доўга шукаў свой стыль. Спачатку рабіў скульптуры з дрэва. Знаходзіў і іншыя спосабы бюджэтнага стрыт-арту. Але ў выніку пачаў выкладваць мазаіку — і рабіць гэта не так, як іншыя, па-свойму.

Скрытуцкі зрабіў на дзіцячай пляцоўцы вялізныя галовы Чэшырскіх катоў і саму Алісу, якая нібыта сядзіць на пляцоўцы, Маленькага прынца і яго Ліса. Тут жа можна пабачыць лавачкі і горкі ў форме розных звяроў. Таксама сцяну ў выглядзе спіны ката. А на ўваходзе сустракаюць усіх маленькія трубадуры, якія сядзяць на вялізных стосах падушак. І ўсё навокал — гэта фігуркі, абліцаваныя маленькай рознакаляровай мазаікай. Так, на гэтай пляцоўцы, безумоўна, добра дзецям. Аднак дарослыя, якія ў рэальнасці зазвычай не сутыкаюцца з казкамі... тут адчуваюць сябе проста выдатна! Вось ён, чарадзейны свет, але свет рэальны.

Усё геніяльнае проста. Мы самі ствараем сваю рэальнасць. Упрыгожваем пад'езды, робім вялікія пано на ўсю сцяну. Часам укладваем кавалачкі душы ў дзіцячую пляцоўку ці кветнік пад акном. Усё проста. Усё так проста.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**


Гравюра з пражскіх выданняў Скарыны 1517 года.

сімвалічнымі азначэннямі яны і дагэтуль прыцягваюць сваім схаваным сэнсам даследчыкаў. Філолагі вывучаюць найбагацейшы моўны пласт скарынаўскіх кніг.

Не будзе перабольшаннем, калі скажу, што з імем Францыска Скарыны беларусы выйшлі з гістарычнага небыцця, калі ў XVIII стагоддзі ягоная постаць прыцягнула ўвагу даследчыкаў. Ягонае імя сведчыла аб высокай культуры продкаў беларусаў. Яно стала ў XIX стагоддзі своеасаблівым паролем беларусаў у сусветнай культурнай прасторы, нашым гонарам у гісторыі. Яно прайшло з беларусамі драматычнае XX стагоддзе ў час змрочных рэпрэсій нацыянальнай культуры і гісторыі. Яго выкрэслівалі з гісторыі, але не змаглі выкінуць з яе. Зрэшты, даводзілася прызнаваць ягонае культурна-гістарычнае значэнне для ўсіх усходнеславянскіх народаў. Беларусам «дазволілі» мець Скарыну! Ягонае імя ўключылі ў падручнік па гісторыі СССР — адзінае, апроч Канстанціна Каліноўскага, імя беларуса. Але і гэтага было дастаткова для сведчання аб нашай гісторыі. З'явіліся мастацкія творы, прысвечаныя Скарыну, нават фільм «Я — Францыск Скарына» з маладым тады Алегам Янкоўскім у галоўнай ролі. Нарэшце ў першыя гады незалежнай Рэспублікі Беларусь галоўны сталічны праспект (былы Ленінскі) называўся праспектам Францыска Скарыны, а цяпер яго імя носіць вуліца каля будынка Нацыянальнай бібліятэкі, дзе стаіць і помнік першадрукару. Той, хто прысвяціў сябе пашырэнню сярод людзей «мудрости, умения, разуму и науки», варты не толькі пашаны, але і нашага гонару. І з далёкіх часоў гучыць яго мудры заклік: «Да совершен будет человек Божий и на всяко добро уготован!»

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «СПЕЦРЕМОНТ», 220036, г. Минск, Бетонный проезд, 13<br>тел./факс 8017-213-62-05 |

**Предмет аукциона**

| Лот п/п | Инв. № | Наименование предмета аукциона, год выпуска/дата принятия к бух. учету | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС 20 % | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС 20 % |
|---|---|---|---|---|
